Паліна Качаткова

Зялёны сон

Аповеды

Водар свята

17 снежня ў беластоцкім гіпермаркеце жанчына зняла з паліцы маленькае шкляное начынне з надпісам «Водар свята».

Пакруціла ў руках, паспрабавала панюхаць, але абяцаны водар быў надзейна схаваны пад шклом.

Пакуль не набудзеш рэч, не раскрыеш маленькую колбачку, водару свята не адчуеш.

Як уяўляецца свята? Вось так, адразу — не думаючы. Як на каляднай паштоўцы (нездарма ж іх малююць) — дамок пад заснежнымі дрэвамі, у двары жывая ўпрыгожаная ялінка — з шарыкамі. На ялінцы мігцяць агеньчыкі. На стале высокія чырвоныя свечкі... Шчырыя размовы, калі можна гаварыць пра ўсё і цябе разумеюць. Радасць. Надзея. Вера ў будучыню. Што яшчэ? Водар свята — пах елкі, мандарынаў, смачнай ежы.

Няўжо гэта ўсё тут — за тонкім шклом? Раскрыеш, ці разб’еш, і водар свята разліецца наўкола, апануе?

Дарэчы, свечкі... Побач з водарам свята на паліцы — шкляныя падсвечнікі — важкія і празрыстыя. Яна ўзяла адзін з іх. Для свята.

Снежаньскія сутонне і змрок — гэта нешта.... Як правальваешся ў іх. Сяброўка кажа:

— Там ёсць нейкае абяцанне, у гэтым сутонні і мораку. Гэта голас з казкі ці цуду. А казка і цуд не бываюць добрыя. Нават пра Калабка. Гэта змрок напоўнены нечым, дакладна — чарамі. У змроку абяцанне — часам падманлівае вельмі і небяспечнае. Чары, магія, няўлоўнае, але вельмі адчувальнае.

І вось — чары. Сапраўдныя, прафесійныя.

— Дома ў цябе пустата, — гаварыла варажбітка ў Менску, у шэрым доме калі кінатэатра «Змена».

Пустэча. Пустка.

Вакол людзі, ад якіх нічога добрага не пачуеш. Стаіш побач — і ўся энергія як пыласосам высмоктваецца. Дарэшты.

Яе ўгаварыла схадзіць да варажбіткі сяброўка, бо мела праблемы з мужам. Спачатку трэба было знайсці адрэсу, а пасля атрымалася, што трэба і схадзіць.

Знайсці адрэсу было прасцей, па панядзелках яна хадзіла ў саўну і басейн з кабетамі, якія былі звязаныя паміж сабой толькі гэтай лазняй — у асноўным прадпрымальніцы.

Але была сярод іх і жонка дэпутата, у мінулым прадавачка ў кнігарні. Цяпер яна не працавала, але ўвесь час шукала сувязі з

іншасветам, які мусіў дапамагаць у вырашэнні штодзённых праблемаў, а таксама спрыяць аздараўленню.

Вось у жонкі дэпутата і атрымала кантакты варажбітак, дзве з іх жылі аж у Паўночным пасёлку, і толькі адна бліжэй да цэнтру, калі кінатэатра «Змена». Спачатку яна думала, што місія яе скончыцца толькі адрасам варажбіткі, але сяброўка сказала, што трэба ісці разам.

Гэта, як гульня, у якую табе прапанавалі згуляць. Ты можаш адразу адмовіцца. І нічога не будзе. Усё спакойна. Ты можаш нават назіраць, як гуляюць іншыя. Але калі пачаў гуляць, то ці зможаш выйсці з гульні, ці будзеш гуляць да знямогі, — ніхто не ведае, нават ты сам не ведаеш, чым скончыцца гульня.

Адмаўлялася спачатку, казала, што Адвент (ад лацінскага слова «прыйсце»), што Пост перакалядны — час утаймоўвання жаданняў і спакусаў. Ісці ў такі час да варажбіткі не варта, нядобра, бо гэты час для роздуму і спасціжэння.

Але пайшла — за кампанію.

Дом ў стылі сталінскага ампіру, «сталінка», як пішуць у аб'явах па продажы нерухомасці, Кватэра на першым паверсе. Націснулі на званок. З кватэры, як ці то ў фільме, ці то ў казцы данеслася:

— Адчынена.

За дзвярым адразу пакой, шчодра аздоблены праваслаўнымі іконамі. У пакоі — нікога.

— Праходзьце, — пачуўся голас збоку.

Варажбітка сядзела на кухні. Мажная, з хімічнай завіўкай і засаленымі картамі — класіка жанру.

І вось пачался варажба:

— Дома ў цябе пустата, у душы пустата.

Зразумела. Тут не трэба і варажыць.

Вось яшчэ:

— Дарога…

Гэта таксама не навіна, вядома — трэба ехаць у Беласток.

І недавер да варажбіткі адбіваецца на твары.

І тут навіна:

— Ты паедзеш у горад, у якім нарадзілася. Надоўга. Назаўжды.

— Што? Што я там буду рабіць.

— Жыць.

— Чаму?

— Зоркі так склаліся.

Якія зоркі? Варажылі па картах.

Выйшла ў калідор. Прыйшла чарга сяброўкі.

— Змяні стаўлене да мужа і ўсё зменіцца, а ўсе праблемы ў вас пачаліся з адной п’янкі, — даносілася з кухні.

— З якой п’янкі?!!

— З п’янкі, якая была ў вас дома.

Чакала сяброўку. У вітальні ўжо былі іншыя жанчыны, якія жадалі ведаць сваю будучыню. І быў нават адзін вельмі сумны мужчына з выглядам загнанага аленя.

— Дарма схадзілі, — сказала сяброўка, калі пасля палілі ў халодным парку. — Нічога яна не распавяла.

І вось Беласток, гіпермаркет, на далоні «водар свята». Шкляны падсвечнік. Купіць чырвоныя свечкі — і ў дарогу з з водарам свята ў кішэні.

— Мяне там чакаюць. Я прывязу водар свята.

Чэргі на польска—беларускай мяжы. Мытнікі трасуць торбы, узважваюць прадукты. Людзі нервуюцца. Халодна, золка. Мокры снег. Адліга.

Менск. Чыгуначны вакзал са святочнай елкай, шары на ёй грукаюцца адзін аб адзін ад ветру. Толькі што з’ехаў цягнік, да гораду, дзе яна нарадзілася. Наступны ў чатыры раніцы.

І таксісты:

— Куды едзем, куды едзем?

— Вы туды не возіце, куды я еду.

— А вы скажыце, можа возім.

Сказала.

— 100 даляраў і паехалі.

Паехалі. Таксіст нават прапанаваў плед — вось яна — утульнасць. Вось дарога да свята, цяпла і супакою. А водар свята ў кішэні.

Снег. Сасна пры дарозе. Шлагбаўм. Назва станцыі «Хорбарава» — ёсць у гэта назве нейкае трывожнае абяцанне. Але назва толькі на імгненне з’яўляецца ў святле фар. І знікае

Таксі праязджае чыгуначныя рэйкі, шлагбаум. Да горада, дзе яна нарадзілася, застаецца зусім недалёка.

Назад не павернеш. Назад таксі паедзе без яе, а цёплы плед застанецца на пустым месцы пасажыра. Яна верыць, што наперадзе свята, што праз год можна пасадзіць жывую елку ў двары, што кот будзе спяваць песенькі, вецер хістаць дрэвы каля дому, а ў доме (які яна адрамантуе — абавязкова — а як іначай) будзе утульна і спакойна. І знікіне пустэча ў душы і навокал.

18 снежня 2014 года

Кватэра № 0

— Ці жывуць тут людзі?

Маладая жанчына адчыніла шырокія, высокія і цяжкія дзверы і ўбачыла Старую жанчыну. З пад'езда пацягнула холадам, якраз у гэты момант нехта заходзіў з вуліцы, а кватэра была на першым паверсе, першай ад уваходу.

— ЯК ДОБРА, нарэшце ў гэтай кватэры жывуць людзі, — працягвала Старая жанчына. — Вы жывяце тут? — удакладніла яна.

— Так, я тут жыву.

— Як добра, што вы тут жывяце, але… — яна зрабіла паўзу, як бы падбіраючы словы, — але калі Вам раптам… раптам будзе, зробіцца… страшна, вы прыходзьце да мяне.

Я, Цыля Львоўна, і я жыву паверхам вышэй — у такой жа кватэры, як гэта, як ваша кватэра.

У пад'ездзе зусім халодна, халодна стаяць нават каля адчыненых у кватэру дзвярэй, і Маладая жанчына прапанавала Цылі Львоўне зайсці, але тая адмовілася і пайшла на другі паверх — да сябе.

Маладая жанчына зачыніла дзверы кватэры на першым паверсе. Яна вярнулася да перапыненага занятку — упрыгожвання ялінкі. Быў 1996 год, яна ўпершыню адзначала Каляды ў гэтай кватэры, таму ёй давялося схадзіць у найбліжэйшую ад дому краму, а гэта быў ГУМ, каб набыць ёлачныя цацкі. Шары і дожджык, бліскучы дожджык — вось, што яна хацела набыць.

Хацела набыць рознакаляровы шары, каб усе былі рознага колеру, і зялёны ці залацісты дожджык. Але шары ў ГУМе прадаваліся толькі ў наборах — аднаколерныя.

Падлічыўшы грошы, яна вырашыла купіць набор срэбных шароў: каб атрымаць разнаколерныя, яна мусіла набыць тры розныя наборы, а гэта было нерэальна. І «дожджык» для елкі прадаваўся толькі срэбны. Ад разнаколернага свята давялося адмовіцца — набыла срэбныя шары і срэбны дожджык, хаця хацела штосьці зялёна—фіялетава—сіне—залацістае. Свята будзе срэбным.

Ялінка ўжо стаяла ў пакоі ў трохлітровым слоіку з вадой, пастаўленым у вядро, вядро было прымацавана да паркету скотчам. Ялінка будзе ўпрыгожаная срэбнымі шарамі і срэбным дожджыкам, быццам бы яна так захацела, спланавала, і ніхто не зразумее, што хацела яна зусім іншага.

І ялінка… ялінка прыехала ў кватэру ў багажніку машыны яе каханка, ці, як кажуць, «сябра». Хаця ці можна назваць гэта

сяброўствам? Не сяброўства — зусім іншае. У багажніку былі дзве ялінкі, толькі адна паехала далей — да сям'і яе «сябра».

А адна была занесеная ў кватэру. А магло быць наадварот, тая ялінка засталася б ёй, а гэтая паехала б туды...

Думкі былі троху блытаныя, як заўжды, яна не магла зразумець, чаму ўсё адбываецца так, як адбываецца, і што, галоўнае — хто ўплывае на тое, каб адбылося так, а не інакш. Ведала, што чалавек, які прывёз ялінку, прыйдзе да яе на свята.

Скажа дома, што паедзе на рыбалку і з'явіцца ў аблічччы зімовага рыбака — са скрыняй, з прыладамі і ў кажуху.

А пасля ад яе сапраўды паедзе на рыбалку, бо зімовая рыбалка для яго — сапраўднае свята.

Людзі па—рознаму адчуваюць сябе ў перадкалядны таямнічы і зіхоткі час.

Хочацца быць гераіняй паштоўкі з бліскучым снегам, маленькай ялінкай і дамком са свечачкай па надваконні. Але ж хто возьме цябе на тую паштоўку?

«Сама сябе, у абдымкі — і на самую любімую паштоўку. Толькі так яно і магчыма, баюся», — так параіла ёй сяброўка. — Трэба ўпрыгожыць ялінку, паставіць свечачкі — і ўлезці ў паштоўку. Пажадана яшчэ паклікаць сяброў, відаць, у ідэале».

Накінула куртку і пайшла выносіць смецце, дом быў стары, пасляваенны, без смеццеправоду.

У марозным паветры моцна адчуваўся пах кухні ад рэстарану, што месціўся ў тым жа доме. Тое, што зусім нядаўна было калюжынамі, замерзла і ператварылася ў ледзяную бугрыстую паверхню, быццам бы замерзла хвалістае мора. Ісці па такой ледзяной паверхні трэба асцярожна, каб не паваліцца на лёд.

— Стаяць!

Спынілася. Перад ёй стаяў высокі Мужчына:

— Леанід, — прадставіўся ён.

Каля Леаніда стаяў чорны пудзель.

Яна нахілілася, каб пагладзіць сабаку і зразумела, што сабака зусім стары — уся барада ў яго была сівая і ён цяжка дыхаў.

— Ці не твае гэта сяброўкі пілі ўчора на пляцоўцы паміж першым і другім паверхам?

— НЕ.

Яна спалохалася такога пачатку размовы.

— Ладна, я жартую. На самай справе я хацеў даведацца,
чаму ты жывеш тут, у самым эпіцэнтры Мінска.

— У ЭПІЦЭНТРЫ?

Згадала заняткі па пачатковай ваеннай падрыхтоўцы. І малюнак з ядзерным грыбам.

— А ты нічога не адчуваеш у гэтай кватэры?

— Што я мушу адчуваць?

— Такое... накшталт туману? Туману, які ахутвае цябе... Як ты спіш? Жахі сняцца?

Яна шмат працавала апошнім часам і практычна не думала ні пра што, апрача працы і грошай, якія можна зарабіць працай. Часам думала пра свой лёс і пустую долю, але пра гэта — усё менш і менш. Стомленая, ледзь даходзіла да сваёй новай цёмна—чырвонай канапы (нізкай, амаль упоравень з падлогай) валілася і засынала. Ці былі жахлівыя сны і трызненні? Хто яго ведае, былі не былі. Рэчаіснасць была як трызненне. Але яе сяброўка, якая заначавала ў яе аднойчы пасля карпаратыву, падхапілася пад раніцу з лямантам: «Як ты тут жывеш!» і сталі ліхаманкава збірацца дадому, дзе яе чакалі муж і дзеці. Заявіла, што ўсю ноч яе нехта душыў. Але гэта больш падобна да гісторыі пра посталкагольнае пачуццё віны і прадчуванне сямейнага скандалу.

— Пакажы мне сваю кватэру, — запатрабаваў Леанід.

І яна, як загіпнатызаваная, павяла яго за сабой, за імі пайшоў і стары чорны пудзель.

Не паспелі яны пераступіць парог, як ён рэзка схапіў яе і пацягнуў да сябе.

— Вы што?

Выкручвалася ад яго як магла.

— Ты яшчэ не ведаеш, хто я на самай справе, — казаў ён ёй.

— Якая мне розніца!

— Леанід! Леанід! — пачуўся з панадворку жаночы голас.

На кухні завыў, падаў голас чорны пудзель.

— Ідзіце, вас ужо жонка шукае.

— Я яшчэ адпомшчу табе, — паабяцаў ён і выйшаў за дзверы разам з пудзелем.

Напусціла глыбокую чыгунную ванну, залезла ў гарачую ваду і глядзела як на руках і ўсім целе праяўляюцца сінякі. Пасля дайшла да канапы і правалілася ў сон. Быў вечар, яшчэ не позна, а яна заснула.

Абуджэнне было нечаканым, прачнулася ад таго, што адчула нечую прысутнасць. Дакладней не прысутнасць, а так — пах мужчынскай парфумы.

Рэзкі пах адэкалону, чужога, незнаёмага, але... так пахла ад ветэранаў, якім яны ў школе на 9 мая дарылі кветкі. І яшчэ пах

тытуню. Пах быў быццам побач знаходзіўся чалавек. Яна падскочыла. Нікога не было. Зусім нікога. Адна ў кватэры.

Закруціўшся у халат, з ключамі ў руках — у стылы пад'езд і да суседкі.

Яе быццам чакалі ў гэтым невялікім пакоі з пусты акварыумам, з адшліфаванымі морам каменьчыкамі і сухой марской зоркай — дыскападобнае цела, да якога прымацаваныя пяць промняў—рук.

— Ад мужа застаўся акварыум…Ён вельмі любіў акварыумы. Гэта апошні, астатнія аддала ў дзіцячы дом. Ведаеце, да вайны я працавала ў дзіцячым доме, не тут, не ў Мінску, у Гомелі, мы паспелі эвакуявацца разам з дзецьмі. Калі збіралі дзіцячы эшалон, начальства казала, што прадукты браць не трэба, што ўсё дададуць «на месцы»… Яны яшчэ шмат чаго казалі і абяцалі, але сэнс усіх прамоваў быў у тым, што прадукты не трэба браць з сабой, што дзяржава паклапоціцца…

Я была маладая, але здолела дамагчыся таго, што ў наш вагон далі прадукты. Мы доўга ехалі, ні на якім «месцы» нам нічога не далі, і з нашага вагона карміўся ўвесь эшалон.

Я працавала з наймалодшымі дзецьмі. Мы іх вучылі па сістэме Фрыдрыха Фрэбеля.

— Па гэтай сістэме выхоўвала сваіх дзяцей Марыя Апанасаўна Багдановіч, маці паэта.

— Сістэма была моднай і да вайны, яе практыкавалі і ў нашым дзіцячым доме, а пасля… усе сістэмы зніклі і засталася адна савецкая педагогіка.

— Я прыйшла, бо вы сказалі прыйсці, калі будзе страшна. Я сапраўды адчула нешта такое… Мне стала страшна. Чаму вы спыталі «ці жывуць тут людзі?», калі прыйшлі да мяне.

Гэта кватэра нумар адзін, хіба ў ёй не жылі людзі?

— Што вы адчулі?

— Пахі… Пах мужчынскай парфумы, якога не павінна было быць. Рэзкі пах мужчынскага адэкалону і тытуню.

— Так, так, як раней казалі, мужчына мусіць быць чыста паголены і крыху п'яны.

— Наконт «п'яны» я не ўпэўненая. Але пах быў, быццам бы чалавек побач, а нікога не было.

Сухая марская зорка ў акварыуме на імгненне нагадала калядную зорку, але толькі на імгненне. І яна згадала, што некаторыя віды марскіх зорак выварочваюць свой свой страўнік вонкі, каб ахутваць і пераварваць ахвяру—малюска.

— Гэта кватэра… можна сказаць, што гэта кватэра №0, нумар адзін, на ёй з’явіўся, якраз перад тым, як вы з’явіліся ў гэтай кватэры.

— Кватэра №0?

— Так, былі такія кватэры… дзе людзі, якія супрацоўнічалі з КДБ, сустракаліся са сваімі кuratарамі.

— У кватэрах? Навошта?

— Для таго, каб ніхто не заўважыў.

Чалавек сярод белага дня не заходзіць у будынак КДБ, а — павярнуў у арку, забег у пад’езд і шмыг — у першыя ж дзверы. Ці мала хто да каго ідзе, можа ў госці, можа па справах.

— Так, па справах.

— І гэта кватэра была менавіта такая, пакуль не з’явіліся вы,

і ведаеце што, я зраблю вам падарунак.

— Ой, што вы, што вы, не турбуйцеся.

— А гэта і не зусім мае падарункі, гэта Дарункі ад Фрыдрыха Фрэбеля. Для развіцця дзіцяці ў самым раннім веку Фрэбель прапанаваў шэсць «дарункаў». Першым з’яўляюцца мячыкі.

— А для чаго яны, мячыкі?

— Каб выхавацель мог паказваць дзіцёнку мячыкі рознага колеру, развіваючы такім чынам яго здольнасць адрозніваць колеры. Разгойдваючы шарык у розныя бакі і прыгаворваючы «наперад—назад», «угару—ўніз», «направа—налева» — так выхавацель знаёміць дзіця з прасторавымі ўяўленнямі. Паказваючы шарык на далоні і хаваючы яго, прыгаворваючы пры гэтым «Ёсць мячык — няма мячыка», знаёміць дзіця са сцвярджэннем і адмаўленнем.

Суседка працягнула ёй невялікія, мяккія, ваўняныя мячыкі, пафарбаваныя ў розныя колеры — чырвоны, памаранчавы, жоўты, зялёны, сіні, фіялетавы (гэта значыць колеры вясёлкі) і белы. Кожны мячык—шар — на матузку.

Яшчэ з лесвіцы яна ўбачыла, што каля яе кватэры стаіць чалавек у зімовым строі рыбака са скрыняй з прыладамі і пакункам з прадуктамі. Быццам бы нічога не змянілася, усё, як запланавалі.

22 снежня 2012 года

Школа № 26

Маньяк у доме "Палітпроса"

"Дом палітпроса" — дом палітычнай асветы, скарочаны варыянт ад расейскага "дом политпросвещения". У часы „развітога сацыялізму", якія пасля былі названыя „часамі застою", кожныя два тыдні ў Гомелі нас са школы па вечарах вадзілі ў абавязковым парадку ў «Дом палітпроса» — на лекцыі пра міжнароднае становішча. Доўгімі восеньскімі вечарамі туды ж заганялі яшчэ шмат дзяцей з іншых гарадскіх школаў. Зала вялікая, крэслы чырвоныя, мяккія. Лекцыі нуднейшыя — пра сіянізм, пра амерыканскую ваеншчыну і барацьбу за Мір у СССР. Чыталі лекцыі памятыя дзядзечкі з трыбуны — мала што разабраць было. І слухаць нецікава — тады прамовы з такім зместам ліліся — з радыё, з тэлебачання, з газеты «Правда», якую нам даводзілася чытаць, рыхтуючыся да штотыднёвых палітінфармацый у класе. Быў набор словаў, які прагаворваўся, як бы міма свядомасці, але… відаць трапляў у падсвядомасць. Шум, ідэалагічны шум. І вось у доме «Палітпроса» завёўся маньяк. Сексуальны вычварэнец. Педафіл, якога вабілі дзяўчаты—падлеткі. Уваход у дом палітычнай асветы быў бясплатны і не надта кантраляваўся. І маньяк даведаўся пра такую зручную пляцоўку, дзе шмат дзяўчат без бацькоў. І пачалося… Маньяк адсочваў ахвяру, ціхенька—спакойненька сядаў за спіной дзяўчынкі. І як толькі лектар пачынаў нудзець пра сіянізм і агрэсію, маньяк нахіляўся над вухам дзяўчынкі і пачынаў нашэптваць непрыстойнасці з назвамі ўсіх органаў і дзеянняў. Ахвяра сядзела ў мяккім крэсле паралізаваная ад немагчымасці нічога зрабіць. Лекцыя заканчвалася, маньяк сыходзіў. І мы ведалі, што кожны раз падчас лекцыі маньяк будзе ў зале. Паскардзіцца настаўнікам немагчыма, бо нават не ведалі як сфармуляваць. Маньяк быў брыдкі і дастаўучы. Але мы яго перамаглі. Перамога з'явілася вынікам супольных дзеянняў. Не памятаю, хто прыдумаў. Але ідэя была геніяльная: аб'ядноўвацца ў группы, глядзець на маньяка ва ўпор і абгаворваць яго, абсмейваць, перамагаючы страх. І гэтая публічнасць маньяка даканала — ён не здолеў быць аб'ектам кпінаў і знік з далягляду, прынамсі, у той дзень, калі прыходзіла на палітасвету наша школа №26. Цяпер ніяк не магу зразумець настальгіі па СССР, асабліва ў маладых людей, якія настальгуюць па тым, чаго не ведаюць, а калі нешта памятаюць — то пламбір па 20 капеек, ды газіроўку па 3 капейкі. Згадваю доўгія нудныя прамовы, поўныя нянавісці да ўсяго свету, хлусню, аднастайнасць

жыцця ды яшчэ шмат чаго брыдкага. Саветызацыя — гэта зло, адназначна.

Ганаровая варта

На 9 траўня ў Гомелі падчас параду ветэранаў мы стаялі ў гольфах і з белымі бантамі ў ганаровай варце каля помніка Леніну на плошчы, насупраць тэатру. А на 11—га верасня ў нас была варта каля помніку Дзяржынскага, насупраць КДБ, бо наша піянерская дружына была названая ў гонар Дзяржынскага. Аднойчы пачалася бура: дождж, вецер, галюкі з дрэваў паляцелі. А класная не ведала, што рабіць. Так мы і стаялі пад дажджом. Тады з будынку выскачыў „рыцар з гарачым сэрцам" і спрабаваў зняць нас з варты. Але мы не сыйшлі. Ён пабег да настаўніцы, каб паслалі наступную змену — і толькі тады мы пакінулі пост. Пасля нас мокрых завялі ў КДБ — паказалі музей, гарбатай напаілі. Яшчэ ў Гомелі нас ставілі на „Почётный пост №1″, каля Вечнага агня. На тыдзень здымали з урокаў, выдавалі паўвайсковую форму і муляжы аўтаматаў. Кармілі ў кавярні „Залатая Рыбка". Там кіраваў маёр — тады яшчэ рэальны ветэран (быў 1982 год). Маёр паходзіў з Расеі і вучыў нас клятве з „оканнем": „У (націск на О) Огня и Гранита ЮнОрмеец стОит, нет ничто не забытО и нікто не забыт! С гОлОвамі пОнікшімі над Отцами пОгибшими станем мы…" Як мы рагаталі з гэтага вымаўлення. А потым апагей: „То, что Отцы не доделалі, мы дОделаем". Апошнюю фразу мы проста не маглі паўтарыць без рогату, і працэдура падрыхтоўкі прыняцця прысягі працягвалася — у двары Кінатэатра Калініна — за Вечным агнём. І яшчэ — казалі, што выбіраюць выдатнікаў на „Почётный пост №1″, а гэта было няпраўда — выбіралі тых, у каго ногі доўгія і роўныя. Ваенрук ішоў — глядзеў на ногі і казаў: "Ты, ты і ты!" А яшчэ мы верылі ў піянераў—герояў, і шмат размаўлялі пра тое, што рабіць, калі пачнецца вайна. — А ты вытрымаеш, калі табе пілой будуць пазваночнік пілаваць? А калі зорку выразаць на спіне? А рукі ў агонь? Быць аблітым вадой ледзяной на марозе здавася літасцю ад ворага ў параўнанні з іншымі відамі катаванняў. Як іх вытрымаць? Як не выдаць таварышаў? І выйсце бачылі адно — суіцыд, каб не стаць здраднікамі пры катаваннях.

Дзіцячы працоўны лагер

У вёску Рудня Шлягіна, якая ўжо не існуе пасля Чарнобыльскай катастрофы, нас везлі з Гомеля спачатку па рацэ — па Сажы на ракетах — "падводных крылах". Пасля на грузавіках. Калі прывезлі, патлумачылі, што ў нас быў спецрэйс, а так — сюды толькі на самалётах "кукурузніках" можна даляцець, таму бацькоў не варта

чакаць у госці падчас працоўнага лагеру. Нам было па 13 гадоў. Мы палолі моркву. Капаніцамі капанічылі траву і выдзіралі рукамі. Мы жылі ў былой царкве, дакладней капліцы, якая стаяла пры могілках. Справа ад царквы былі могілкі з крыжамі. На крыжах — белыя вышытыя рушнікі. Яны варушыліся ўначы пад ветрам. У 1981 годзе я страшна далёкая ад народкай культуры была ўпэўненая (і не толькі я), што рушнікі адмыслова навязалі на крыжы, каб палохаць нас, каб страшна было ісці ў прыбіральню ноччу. А прыбіральня была, нават не ведаю як сказаць… збоку, каля…могілак, але яна была практычна на саміх могілках. Каля ўваходу ў царкву была яшчэ адна асобная магілка — за агароджай. Мне мясцовая дзяўчынка патлумачыла, што тут падчас вайны чалавека бомбай забіла. І так забіла, што пахаваць, тое што засталося, давялося тут — адразу на месцы. Пахавала адна добрая жанчына, якая і да гэтага часу даглядае (на момант 1981 года). З мясцовых жыхароў я закантактавала з адной дзяўчынай, якая размаўляла быццам бы па—руску (яна так сама думала), але так, што я не ўсе словы разумела. Яна паведаміла мне ўрачыста, што ў іх школе ёсць настаўнік, які “говорыць толькі па беларуску” і, так “смешна”. І, магчыма, ён нават паэт. Хто бы гэта мог быць? Хто гэты беларускі паэт? Хто гэты адважны чалавек сярод балот? Падумайце — вёска Рудня Шлягіна 1981— 1982. Хто з адраджэнцаў апошняй хвалі там настаўнічаў? Па начах мясцовыя лезлі ў вокны царквы, як героі “Вія”. Мы спрабавалі бараніцца. Пад канец працоўнай змены ўсе вокны нашай капліцы былі забіты дошкамі. Шкла не было ўжо. Увесь гэты час з намі была класная — выкладчыца ангельскай мовы. Спала яна таксама з намі ў адным памяшканні. Па начах я класную палохала: прапаноўвала ўявіць, што яе раскладушка стаіць як раз на тым месцы, дзе ў царкве ставілі труну. І, відаць, так яно і было. Класная вішчала, падскоквала і спрабавала перасунуць раскладушку. Марна. А калі падумаць — у нас маглі быць і летнія моўныя курсы. А маглі бы вывучыць мову, ці нават мовы — беларускую і ангельскую. Вёска Рудня Шлягіна стала ахвярай глабальна тэхнагеннай кастрофы СССР. І ангельскую мову з нашага класа ведаюць толькі тыя, хто з’ехаў за мяжу. А такіх у нас шмат. Дырэктар нашай школы фізік — Раальд Зянонавіч Грахоўскі памёр ад анкалогіі, вярнуўшыся пасля працоўнага дзіцяга лагера, які адбыўся адразу пасля красавіка 1986 года. Навошта гэта было? Хто прыдумаў дзіцячыя працоўныя лагеры, падобныя на “хімію”? Не разумею настальгіі па СССР. А ў інтэрнэце ў інфармацыі пра жыхароў вёскі Рудня Шлягіна напісана „2010 год — жителей нет”.

Урок за зялёнай фіранкай

Лічылася, што школе, у якой мы вучыліся (а было гэта ў Гомелі на вуліцы Савецкай), — добры матэматык.

Урок алгебры ў нас пачынаўся наступным чынам: клас дзяліўся на два варыянты, кожны варыянт атрымліваў сваю задачу. Адначасова настаўнік выклікаў двух вучняў да дошкі, яны таксама атрымлівалі ўмовы тых жа задачаў. Вучні станавіліся з двух бакоў дошкі, а настаўнік, як кулісай у тэатры, захінаў іх светла—зялёна фіранкай.

Часам да дошкі даводзілася выходзіць і мне. Так я апыналася за зялёнай фіранкай з аркушыкам паперы — з умовай задачы і белая крэйдай ў руцэ. Упэўненымі рухамі з націскам запісвала ўмовы задачы на дошцы. Напрыканцы ставіла дзве паралельныя рыскі — раўняецца…

І ўсё. Ужо адпачатку, калі запісвала ўмовы задачы, я ведала, што мне яе не рашыць, бо зусім і абсалютна нічога не разумела ў алгебры. І ўсе гэта ведалі. Але мусіла заставацца за фіранкай, і чакаць, калі выпрабаванне скончыцца.

Звонку, за фіранкай дыхаў, перашэптваўся клас, — там хтосьці ведаў, як рашыць задачу, а нехта — не.

За зялёнай фіранкай, калі паглядзець ўгору можна было бачыць над дошкай толькі партрэт матэматыка Лабачэўскага — вельмі падобнага на паэта Блока.

Час сыходзіў, і настаўнік адшморгваў фіранку, я заставалася стаяць перад усімі з нявырашанай задачай — толькі дзве рыскі пасля. Ніхто і не чакаў ад мяне іншага. Фінал быў вядомы адпачатку.

У класны журнал настаўнік ставіў мне кропку — аналаг самай нізкай адзнакі — адзінкі. Меркавалася, што здольная буду выправіць кропку на іншую адзнаку.

Можна спытаць — як я вучылася? Як скончыла школу? Мне дапамагла Каця — сяброўка—выдатніца і шахматыстка, з якой мы сядзелі за адной партай. Гэта Каця рашала за мяне задачы, у тых выпадках, калі гэта было магчыма — не за зялёнай фіранкай. На выпускных іспытах Каця зрабіла і свой, і мой варыянт кантрольнай. Толькі дзякуючы сяброўцы, я атрымала атэстат і скончыла школу.

Калі віншавала Кацю з Новым годам 2015 годам сказала: “Жадаю паспяховага рашэння жыццёвых задач”.

— *Як ты сфармулявала*, — адказала Каця.

І… ў прынцыпе, тэкст не толькі пра жахі школьнага жыцця, гэта аптымістычны тэкст. Бо калі сам нечага не можаш і не ведаеш, то заўсёды ёсць той, хто ведае і дапаможа.

Жыццё штодня ставіць перад намі розныя задачы. І часам здаецца, што яны невырашальныя. Але гэта не так. Кожная задача мае сваё рашэнне. Калі мы рашэння не ведаем, тое зусім не значыць, што яго не існуе.

Прыступкі да паэзіі Максіма Багдановіча

Упершыню верш Максіма Багдановіча я пачула ў пад'ездзе дома 106 па вуліцы Савецкай у Гомеле. На сёмым, апошнім, паверсе. Мне прачытала верш дзяўчына—суседка. Мы сядзелі на прыступках, якія вялі на гарышча. Мы вельмі любілі сядзець на гэтых прыступках з Ленай і распавядаць пра рознае — цікавае. І Лена сказала, што зараз прачытае мне верш па—беларуску, але хай мяне гэта не бянтэжыць, бо хаця звычайна беларускія вершы “непрыгожыя” (быў тады ўстойлівы стэрэатып пра беларускае як пра другаснае і нецікавае), але гэты верш — выключэнне. Лена прачытала верш “Слуцкія ткачыхі”. Сяброўка была старэйшая, у школе мы пакуль не праходзілі Багдановіча — пра прaграме не дайшлі. Мы жылі ў Гомелі ва ўніверсітэцкім гарадку ў доме для выкладчыкаў і студэнтаў. Сяброўка Лена жыла з маці і айчымам, які разводзіў птушак. Іх у яго было больш за 30, і яшчэ ў яго атрымалася звесці разам зябліка і канарэйку. Птушка, якая атрымалася ў выніку, то спявала, як канарэйка, то пачынала пранізліва рыпець. Пасля было знаёмства з Максімам Багдановічам у межах школьнай праграмы, але наша школьная настаўніца, Кудраўцава Клаўдзія Аляксандраўна, больш любіла Янку Купалу і Францішака Багушэвіча — у вольны час яна чытала нам паэмы “Кепска будзе” і “Бандароўна” — па памяці. Але маці паказала мне рандэль — “Нам могілках” — “Амур і сумны і прыгожы стаіць з павязкай на вачах ля склепу”. Верш быў ў зборніку, набытым у 60—ыя гады ў Маскве ў кнігарне, дзе прадавался Літаратура народаў СССР. Здаецца цяпер менавіта там месціцца знакамітая кнігарня “Біблія— Глобус”, а можа я і памыляюся. Бацькі вучыліся ў Маскоўскім ўніверсітэце, дзе навучаліся студэнты з усіх рэспублік, і ў 60—ыя гады ў гэтым асяродку ўзнікла мода на ўсё нацыянальнае. Моднымі былі літоўскія мастакі — Чурлёніс, Шымоніс, а таксама студэнты імкнуліся падкрэсіць сваю нацыянальную адметнасць, і мелі ў сябе кнігі на нацыянальных мовах. Так першы зборнік Максіма Багдановіча, які трапіў да мяне быў набыты ў Маскве.

2015 год

Каляровы дзень

Дзяўчынка выйшла з дому, спусцілася з заснежанага пагорка, падышла да ракі.

Левы берага быў вышэйшы за правы… Пэўна, раней — у далёкія часы — рака была большая, і той пагорак, па якім ішла дзяўчынка, быў дном ракі. А дом, у якім жыла дзяўчынка, месціўся ў былым рэчышчы ракі.

Свяціла сонейка. Снег на пагорку блішчэў, зіхацеў, але дзяўчынку вабіў зялёны лёд і тое, што пад ільдом.

Праз зялёны лёд, які здаваўся празрыстым, яна спрабавала разгледзець жыццё ў вадзе — рыб і водарасці, але нічога не бачыла, толькі адчувала плынь пад лёдам.

Лёд без снегу, і тонкі, бо недалёка з трубы выцякала гарачая вада. Адкуль яна цякла — ніхто не ведаў. Санстанцыя рабіла спробы высветліць — па ўсіх заводах і фабрыках гораду прайшлі супрацоўнікі станцыі і непрыкметна закінулі фарбавальнікі розных колераў — чырвоныя, зялёныя, сінія, жоўтыя і нават чорныя.

Па колеры вады, якая пойдзе з трубы, хацелі даведацца — хто злівае гэта ў раку. Але вада з трубы палілася рознакаляровая — то жоўтая, то сіняя, то малінавая, то фіялетавая. Значыць, усе карысталіся трубой.

Дзяўчынка ведала пра санстанцыю, бо там працавала яе бабуля. Дзяўчынка хадзіла разам з бабуляй па школах і дзіцячых садках, дзе бабуля адмысловым апаратам рабіла «замер святла». Аднойчы правяраць святло прышлі ў Дом дзіцяці, і там дзяўчынка ўбачыла пакінутых дзяцей, пра якіх ёй патлумачылі: «Калі яны падгадуюцца, адвязуць у дзіцячы дом».

Ведала дзяўчынка і пра слоік з матылямі, які знайшлі ноччу на чыгуначным вакзале. І ніхто не ведаў, што рабіць з тым слоікам і з матылямі.

Гаварылі, што, магчыма, дыверсія, што слоік мог быць прывезены на цягніку Берлін—Масква, што матылі са слоіка прынеслі з сабой нябачаную дагэтуль пошасць.

Слоік спачатку збіраліся весці ў Маскву, а пасля перадумалі, бо, можа, менавіта гэта частка хітрага плана дыверсантаў: каб у руках супрацоўнікаў санстанцыі слоік з белымі матылямі трапіў у Маскву, дзе шмат людзей. Размовы пра пошасных матылёў у слоіку ішлі доўга, а чым скончылася справа — таямніца. Можа, нават дзяржаўная таямніца. Яшчэ яна ведала пра мышэй, якія залазяць у пустыя піўныя бутэлькі на бровары…. І яшчэ шмат такога ўсяго ведала.

А падзяліцца сваімі ведамі не было з кім. Дзяўчынка марыла пра сяброўку.

Ва ўсіх кнігах, што ёй чыталі, ва ўсіх дзяўчынак былі сяброўкі. А на іх вуліцы, якая спускалася да ракі і называлася «вуліца Касманаўтаў», дзеці не жылі.

У доме ўжо ўпрыгожылі ялінку розныя — самыя розныя цацкі: на ніжніх галінках цяжкія нямецкія шышкі — важкія, зялёна—ружовыя, а на верхніх галінках шары, якія свецяцца, калі ў пакоі выключыць святло. І яшчэ — празрыстыя шары, яны падобныя на мыльныя і здаюцца вельмі крохкімі — страшна ў рукі ўзяць, але на самай справе яны з тоўстага шкла, толькі шкло гэтае празрыстае. І яшчэ — жабкі, Дзяды Марозы, касманаўты, парашутысты…

На Новы год да дзяўчынкі ў госці прыехалі тата і мама. І дзяўчынка была вельмі радая…

Дзяўчынка паспрабвала прылегчы на лёд, наблізіла твар да зялёнай паверхні. Штосьці быццам пачала бачыць і тут пачула голас — яе клікаў тата.

Дзяўчынка хутка падхапілася — было важна, каб ніхто не заўважыў яе на лёдзе.

Падбегла да таты. Ён стаяў ля брамкі, што выходзіла на бераг і трымаў у руках памаранчавы цацачны шрубалёт. Гэта цацка такая — калі шморгнеш за матузок, шурбалёт зрываецца і ляціць — амаль, як сапраўдны. І дастаткова далёка ляціць.

Дзяўчынка запусціла шурбалёт і ён паляцеў… паляцеў… і сеў на лёд.

Дзяўчынка пабегла да ракі, але тата спыніў:

— Не трэба, я сам. Табе нельга на лёд.

Ён асцярожна спусціўся на лёд і ўзяў памаранчавую цацку. Дзяўчынка стаяла, чакала тату.

— Чаму мне нельга на лёд? — спытала, калі тата вярнуўся.

— Бо можна праваліцца. А гэта самае страшнае. Ты ведаеш, што бывае з тымі, хто праваліцца пад лёд?

— Не… Што…

— Чалавека пад лёд зацягвае, ён б’ецца знізу галавой, але лёд не прабіваецца, яго цягне далей і чалавек задыхаецца.

Яны пайшлі ў дом. Дзяўчынка з’ела пару мандарынаў пад ялінкай, пагулялася з коцікам і зноў пайшла на бераг. Сонца ўсё яшчэ свяцiла, снег блішчэў, лёд вабіў. Але нешта змянілася. На беразе з’явіўся чалавек.

Каля трубы, з якой выцякала гарачая вада, стаяла незнаёмая дзяўчынка ў зялёнай вязанай шапачцы і з белымі валасамі да плеч. Стаяла і глядзела на каляровую ваду.

Над гарачай вадой уздымалася пара. Дзяўчынка падышла да незнаёмай і стала побач. Доўга яны стаялі моўчкі і глядзелі ў каляровую брыдкую ваду. Пасля дзяўчынка спыталася:

— Як тваё імя?

— Юля.

Яна сказала, што яе бацькі здымаюць маленькую хатку ў суседзяў.

Дзяўчынка зразумела — гэта яе сяброўка. І праўда. Яны будуць сябравалі цэлы год. Летам у бацькоў Юлі будзе «ружовае» вяселле, і дзяўчынцы патлумачаць, што трэба прыходзіць ва ўсім ружовым.

Бабуля скажа, што гэта глупства — і само «ружовае»вяселле, і тое, што трэба прыходзіць у ружовым… Але дзяўчынка прыйдзе ў ружовым. І ўсе будуць у ружовым. Яны будуць сядзець на даху гаража і есці ружова—зялёныя яблыкі…

А пасля бацькі Юлі атрымаюць кватэру. А яшчэ праз пару гадоў бабуля будзе замяраць святло ў той школе ў далёкім раёне, дзе будзе вучыцца Юля, і настаўніца скажа, што Юля — рэдкі чалавек, што для кожнага ў яе знойдзецца добрае слова.

Снежань 2013

Зялёны сон

Ноччу глядзелі фільмы з Джорджам Клуні. Пра кілераў, пра спецслужбы, пра барацьбу за рэсурсы, пра здрады сяброў і калегаў дзеля кар'еры і дабрабыту, а таксама пра дробныя (на першы погляд) дробязі, якія ўплываюць на лёсы. Глядзелі фільмы і пілі мятную гарбату з лімонам. Маладую мяту ўзяла ў садзе.

Пачыналася лета. У садзе квітнелі кусты белай шыпшыны і зацвітаў язмін. Крыкі жабаў… Мятны напой дае зялёны травяны супакой. І за акном зялёная цемра, у ёй свецяцца белыя кветкі.

Фільм спаўзаў у сон… і гэта я ўжо бараніла дэмакратыю і правы чалавека, і гэта мне перашкаджалі бюракраты, якія праз адсутнасць у іх гуманізму наймалі бяздушных кілераў. І кілеры былі падобныя да бюракратаў, а бюракраты да кілераў. І шанцаў уратавацца ў мяне не было зусім.

У зялёнай цемры за акном блытаўся вецер, хістаў голле ліп, крычалі каты. Дзікі бела—руды, як поўня, кот, скочыўшы на фортку, але напалохаўся і зваліўся. Усё гэта прыглушана праз зялёны мятны сон.

Зранку тэлефонны званок і грукат у брамку пачаўся адначасова. Прыехала Ленка — сяброўка дзяцінства. Стаяла перад брамай у чорным складскім халаціку, набірала мой нумар на сотавым і грукалася ў браму, побач стаяла яе сіняя машына. Я так даўно не бачыла Лену.

Сяброўства заўсёды цікавіла больш, чым каханне. З каханнем усё зразумела. А сяброўства больш тонкае. Роднасную душу знайсці складана. Каханне звязанае з целам, сяброўства — толькі з душой. Каханне мае матэрыяльны грунт. Што ні кажы, але з целам звязанае яно. Не веру я ў бесцялеснае каханне. Віва сяброўства! Як кажа адна вельмі разумная журналістка з Астраўца, «у сяброўстве не раствараешся так, як у каханні, — застаешся сабой. У сяброўстве няма таго магнетызму, як у каханні, калі без „прадмета“ і не дыхаецца. Сяброўства — гэта дадатковая ступень свабоды, таму што ты ведаеш: на свеце ёсць чалавек, які дакладна за цябе. І ты за яго таксама».

Вось так, «сяброўства — гэта дадатковая ступень свабоды», гэта ж як добра сказана! Менавіта ступень свабоды, а не яшчэ адна ступень эмацыйнай залежнасці.

І яшчэ — з сяброўкамі дзяцінства агульнае застаецца на ўзроўні падсвядомасці. І яшчэ яны памятаюць пра цябе тое, чаго не памятаеш ты пра сябе.

— Ці не бачыла ты сабаку? — спытала Лена.

Я яшчэ не зусім адышла ад зялёнага мятнага сну. Стаяла на панадворку ў піжаме. Не разумела, пра што яна кажа.

— Сабака, пабег у твой бок. Ці бачыла ты яго?

І яна пачала распавядаць пра сабаку. Што некалькі дзён, дзе б яна ні ехала па горадзе, трапляўся ёй на вочы непрыкаяны вялікі сабака, які бег то па ходніку, то па праезнай частцы.

— Быццам яму ўсё роўна — жыць ці памерці. Бяжыць без ежы, без вады, — сказала Лена. — Я пачала думаць, што гэта, можа, знак мне… Куды я, туды і ён. Калі ўбачыш сабаку, скажы мне. Ой, я так даўно не была ў вашым садзе, засумавала. Пакажы мне сад.

Мы прайшлі ў сад. Там Лена адразу знайшла сабе ў траве галіны ад канадскага клёна, якія добра падыходзяць, каб падвязваць памідоры, і папрасіла падрыхтаваць іх для яе — пасячы сякерай. А яна забярэ пазней.

— А як твая дачка? — спытала я ў яе. Дачка выйшла замуж у Амерыку. Пазнаёмілася з мужам, марскім афіцэрам, у Эміратах, дзе спявала ў бары.

— Запісалася на кастынг… паедзе голас спрабаваць, упершыню самастойна 500 кіламетраў да Лос—Анжэлеса. А правілы руху адрозніваюцца ад нашых, там на чырвоны зусім нельга паварочваць. Гэта дачка мне сказала: «Мама, прыблудныя сабакі забіраюць усё кепскае, калі іх прытуліць».

Лена распавяла, што цяпер працуе на фірме, якая гандлюе сілікатнымі блокамі, а ў музычнай школе толькі на 0,5 стаўкі.

І слушна зрабіла: працу трэба мяняць час да часу, калі нехта кажа пра працу «мы адна сям'я», гэта насцярожвае і хочацца сказаць «праца — не сям'я, так не бывае». Гэта проста маніпуляцыі, каб знішчыць дыстанцыю, каб пасля на правах «блізкага чалавека» лезці ў душу і там таптацца.

І яшчэ я паказала ёй мансарду, там гарышча раней было, а мы падлогу зрабілі.

— А вось тут мы з табой шукалі патаемныя куткі… Тут васількі сушылі.

Была ў нас такая гісторыя з васількамі. У 1978 годзе ў аптэцы мы прачыталі аб'яву, што за кілаграм здадзеных васількоў даюць 10 рублёў. Яшчэ там быў таямнічы «лікаподзій», за кілаграм якога давалі 15 рублёў. Цяпер можна набраць слова ў google і даведацца, што такое лікаподзій, а тады такой магчымасці не было, і мы заняліся нарыхтоўкай васількоў. Васількі раслі ў полі на другім беразе Дняпра. Кожную раніцу мы адчаплялі лодку ад цяжкога ланцуга, пераплывалі на той бераг, збіралі васількі. Пасля сушылі на гарышчы. Так прайшло

лета. У выніку было расчараванне. У аптэцы нам сказалі, што, каб атрымаць грошы, трэба здаць кілаграм пялёсткаў васількоў… на гэтым усё. Я і цяпер не ведаю, ці магчыма набраць кілаграм сухіх пялёсткаў васількоў. А расчараванне зрабілася нашым спадарожнікам назаўжды.

— Вось тут мы сушылі васількі, — прамовіла Лена, — як мне цяпер адсюль спусціцца? Баюся вышыні.

На развітанне яна яшчэ раз нагадала:

— Пабачыш сабаку — тэлефануй.

— А што ты ад яго хочаш?

— Накармлю хаця б, а можа, і сабе вазьму, калі ён са мной пойдзе.

Вось так — літасць і лютасць, розніца ў адну літару.

У мяне на дыску засталося чатыры непрагледжаныя фільмы з Джорджам Клуні. І яшчэ меліса на градах. Меліса пахне лімонамі, і сны ад яе чароўныя, зялёныя, як ад мяты, але з больш фантастычнымі сюжэтамі.

3 чэрвеня 2013

Віленскі Каменны Кот — надзейны і трывалы

Вільня. Час, калі квітнее ліпа.

— Гэта вельмі файныя рэчы, яна вельмі любіла добра апранацца і набывала адзенне толькі ў добрых крамах, — кажа мне жанчына ў сэканд—хандзе.

— Вось, — працягвае яна і паказвае рукой на цэлы шэраг адзення.

“Ну, вось, — думаю я, — любіла добра апранацца, а пасля… Што адбылося?”

— І што здарылася з ёй? Чаму так шмат рэчаў?

Гандлярка сэкандам глядзіць на мяне, як ацэньвае — ці варта казаць тое, што ёсць ці варта выдаваць таямніцу…І ці можа быць таямніца ў сукенкі? Ці рэчы і адзенне звязаныя нейк са сваім першым уладальнікам? Пра люстэркі гэта дакладна вядома, а вось пра сукенкі?

Але гэта ўжо ў Вільні.

А перад гэтым было жаданне адпачыць.

Пашырыць прастору.

Летнія Віленскія канікулы я сабе прыдумала сама.

З Менску ў Вільню — на аўтобусе, не на цягніку. Аўтобус — там ёсць магчымасць заняць месца так, каб побач ніхто не сядзеў, каб ніхто не лез, каб ніхто не задаваў пытанняў. У аўтобусе, які ідзе на Вільню, лягчэй застацца незаўважанаю. Выбіраю — аўтобус.

Дарога маляўнічая і падзяляецца на два этапы: да Ашмянаў і пасля Ашмянаў.

Кожны раз, уражвае колькасць паветра ў вежах касцёлу ў Ашмянах.

І неба мяняецца пасля Ашмянаў, як пад’язджаеш да Вільні.

Вільня. Час, калі квітнее ліпа. Дожджык. Вільгаць. Мокрая дахоўка. Бліскучы брук — чорны, чырвоны, ружовы.

Людзі, якія жылі ў Вільні раней, пра іх ведаеш з кніг і чужых ўспамінаў. Свае ўспаміны пра людзей, якія жылі ў Вільні, і ўжо не жывуць тут і наогул не жывуць… Нідзе. І застаецца толькі спадзявацца на жыццё вечнае.

І не ўсе анёлы на дахах адразу бываюць заўважныя, каб убачыць таго, што не бачна было раней, трэба глядзець на купалы і шпілі. І тады — глядзеш і бачыш анёла на касцеёле святой Тэрэзы. Трэба зварочваць на вуліцы, павароты на якія звычайна не звяртаеш увагі і праходзіш, звыклымі шляхамі. А звыклыя шляхі ёсць і ў Вільні. Пачынаецца дождж. Ціхі, цёплы, пасля — цёплы, але моцны і без

пяшчоты. Адскокваеш ад водных плыняў пад балкон, але вада падае, і ад ветру — залівае пад балконы, мушу з—пад балкону перабегчы ў бліжэйшую краму.

Маленькая крама. Гэта адзін з віленскіх сэканд—хэнд — не той, што Humana, якая працуе па гуманітарнай праграме "Людзі людзям" — набудзеш рэч — і накорміш галодных на Афрыканскім кантыненце. Дык не ў такі сэканд "людзі людзям" я зайшла, а ў прыватны, на вуліцы Sodu.

Спытала, ці ёсць адзенне вялікіх памераў, і мне ветліва адказалі:

— Вельмі шмат у нас такога адзення, якое Вам падыйдзе.

І вось тут і адбылася размова пра адзенне, і жанчыну, якая любіла прыгожа апранацца. А цяпер вось яе адзенне тут — у сэкандзе на вуліцы Sodu.

Я спытала.

— Што адбылося?

— Адна жанчына вельмі схуднела і здае вопратку, калі набудзеце, то дапаможаце ёй. Яна здае адзенне, каб жыць — набываць ежу і плаціць за кватэру.

— Чаму схуднела?

— У яе памерлі бацькі. Яна жыла з імі, вельмі любіла добра апранацца. Ёй падабалася выглядаць прыгожа. Калі бацькі ў яе памерлі, яна пачала здаваць нам тое, што ў яе ў шафах.

— А колькі ёй гадоў?

— За 50… можа 55 ці 56 — недзе так.

Так я набыла сукенку, пакуль ішоў дождж.

Два разы ўсяго пасля апранула — нешта не тое ў ёй было. Так і вісіць.

Вільня. Ліпа. Дождж. Залева. Вада вырываецца з вадасцёкаў. Фатаграфую, як вада вылятае з вадасцёку, пасля — на фотаздымку вада будзе выглядаць падобнай на лёд. Так і бывае зімой — вада замярзае і лёд з вадасцёкаў дугой сягае да прамерзлага асфальту. Але тут не асфальт — брук. На старых вуліцах брук пакладзены адмысова — так, што вада сцякае хвалямі.

А на вуліцы святога Сцяпана — асфальт — ідзеш ногі ў ваде — каламутнай, цёмнай. Брудная вада віруе ля ліўнёвак. Як у нядобрым сне ўсё выглядае. Так зробіш крок ў нябачны падводны люк і панясецца цела ў брудных тунелях — да ракі . А ўсе падумаюць, што ты ўцякла — у сэнсе з'ехала, не захацела быць з імі, а цяпер сама жывеш у прыгожым горадзе і ні дбаеш ні пра каго. Але ж не — лёс твой зусім іншы — каналізацыя, водаканал, аслізлыя і тунелі, тунелі з хуткаплыннымі стокамі. А на выхадзе — станцыя перакачкі, вадзяны

трыснёг, хмызы, андатры і сінія, жвавыя паласатыя малькі окуня, якія тут каля берагу цікуюць свае першыя ахвяры. Сінія паскі на рыбках—драпжніках блішчаць у ваде, калі на іх трапляе сонечны прамь. Зіхцяць на дне ракі і перамутаравыя аскепкі ракавін рачных малюскаў — бяззубак.

Людзі эмацыйна з'ядаць адно аднаго — заглытваюць — як вялікая рыба маленькую — цалкам. І быццам бы так і трэба.

Хачу верыць, што шмат хто са зніклых бяз следу — не становіцца ахвярай маньяка і не ляжыць на дне ракі, а з’ехаў, каб жыць сваім жыццё, тым жыццём, які нарэшце здолеў абраць для сябе. Самоты, вольны, незалежны. І гэта не толькі мая сфера фантазіі — гэта сцвярджае і крымінална хроніка разам са статыстыкай. І фільмаў пра гэта шмат — дакументальныя і мастацкія, кшталту “Без сляда”. Людзі ўцякаюць, каб быць вольнымі, уцякаюць, як з турмы. Ад іншых людзей уцякаюць. Часам доўга рыхтуюць уцёкі, рыхтуюць план, плануюць кожны крок. А бывае, што і спантанна — раз і ўсё. Віктар Цой спяваў: “Закрой за мной дверь, я ухожу». Але лепей не прасіць зачыніць дзверы, лепей не папярэджваць пра сыход. Але не варта і ўцякаць. Уцёкі маюць непрдказальныя вынік. Не ўцякаць — сыходзіць

А да гэтага трэба навучыцца зусім не крыўдаваць і не плакаць. Ставіць рэальныя мэты і пазбыцца ілюзій — развітваючыся з імі па чарзе: з вечару пазбаўляешся, зранку прачынаешся — і на адну ілюзію менш. Ілюзіі пэўны час дапамагаюць жыць, а пасля абцяжарваюць. Вельмі моцна абцяжарваюць. Адкідаеш іх, — яны адлятаць — і позірк ясны. Лёгкасць і мудрасць. Ілюзіі патрабуюць энергіі для падтрымання. Бывае, што раптам ілюзіі зноў вяртаюцца — вылятаюць з цемры, злятаюцца, як начныя матылі на вулічны ліхтар. А яшчэ ілюзіі могуць вяртацца пакрысе — прасочваюцца, як вада.

Вада, вада цячэ па віленскіх вуліца: па бруку, па плітках плітках, па асфальце.

І вось перада мною помнік — агромністы Кот з ружовага граніту.

Каменны кот — надзейны і трывалы.

Вільня, vul. Aguonų тут, тут, адразу за будынкам старога савецкага яшчэ палаца культуры скульптура — вялізны кот, які мае вельмі сумны выгляд. Ён як бы плача.

І не здарма плача каменны кот, плача, бо ў яго памерла гаспадыня — пісьменніца і мастачка Юрга Іванаускайце.

Пра ката і яго гаспадыню—пісьменіцу мне распавядае віленская мастачка Крысціна Балаховіч. Кветкі, якія малюе Крысціна,

невераготна жывыя. Асабліва падабаецца мне карціна, якаяе мае назву “Свята званочкаў”.

— Гэты кот пастаўлены ў памяць пра пісьменніцу і мастачку Юргу Иванаускайце *(Jurgi Ivanauskaitė), скульптура так і называецца Jurgos katinas (кот Юргі). Пісьменніца памерла ад анкалогіі.*

— А чаму скульптара стаіць менавіта на гэтай вуліцы?

— Бо пісьменніца доўгі час жыла на вуліцы Aguonų. Любіла катоў і мела вельмі прыгожага ката, якога пасля забрала яе маці.

— Помнік вельмі вялізны…

— Так. З валуна ў 15 тон, атрымаўся кот вагой у 10 тон, яго вышыня 2, 7 метраў, шырыня 1, 5, таўшчыня 1.50 m. Мае на спіне 13 паскаў. На вялікі жаль, вандалы час ад часу спісваюць гэту скульптуру. Яе ўжо адмывалі некалькі разоў. Але ёсць людзі, якія падыходзяць і гладзяць фігуру катА.

Вільня, vul. Aguonų. вельмі сумны і самотны выгляд у гэтага ката — ён плача, бо гэта кот, у якога памерла гаспадыня.

— Хто рабіў скульптуру?

— Аўтарка сульптуры Ksenija Jaroševaitė. А сквер называецца скверам Jurgi Ivanauskaitė, а ката вырашылі не падпісваць, бо каты гуляюць самі па сабе. Ён і выглядае — быццам выйшаў пагуляць

— А дзе ўзялі вялізны валун?

— Валун знойдзены амаль на другім канцы Літвы ў Келмскім раёне (Kelmė), ля вёскі Pašiaušė.

— А пра што творы Юргі?

— У двух словах цяжка пераказаць — сюжэты складаныя, з жыцця мастацкай і калямастацкай багемы, рок — музыкаў і г.д. У цэнтры самага вядомага рамана "Вядзьмарка і дождж" гісторыя кахання дзяўчыны і ксяндза. Апроч усяго, Юрга напісала дакументальную трылогію пра Тыбет. Зрэшты, Тыбетам і будызмам прасякнуты ўсе яе творы.

“Бывайце, жывіце свабоднымі!” — жадае мне Крысціна.

Чэрвень—верасень 2014 года, Вільня—Менск— Адэса

Гульні з морам

Восень у Адесе — на беразе мора. Я фатаграфавала, але не ўсё. Распавяду пра тое, што не фатаграфавала. Медуз дакладна не фатаграфавала, бо яны былі ўжо нежывыя, хаця і ў мёртвым стане захоўвалі прыгожосць.

Медузы, шмат медуз, вялікіх, дарослых і нават старых з прыкметамі былой дасканаласці, і свабоды, якую мелі ў глыбіні мора.

Спачатку не адрознівала мёртвае ад жывога — спрабавала закідваць, вяртаць у мора медуз, якія захавалі, яшчэ не страцілі колер — блакіты і фіялетавы. Не дапамагала, яны ўжо не плылі. Пасля зразумела — вялікая дарослая медуза на беразе — ужо нежывая. Хвалі марскія, хвалі жыцця забілі яе. А можа яна спакойна памерла ў моры і хвалі толькі выкінулі яе на бераг, канстатуючы канец жыцця, завяршаючы цыкл?

Марскі вецер выносіць — рэальна выносіць з галавы рэшткі ілюзій, рэшткі шматгадовых падманаў і самападманаў. Разумееш: можна жыць і з кракадзілам у ваннай — галоўнае кантраляваць сітуацыю самой, каб не кракадзіл дыктаваў умовы.

Мора пасля начной навальніцы мутнае, адступіла, і дзеці збіраюць мідыі і рапанаў. Варона дзяўбе ракавіну малюска, выцягвае мяккае цела.

Мора адступіла, і я пагуляла па дне марскім. Упершыню ў жыцці знайшла на пяску ракавіну рапана — ружовую ўсярэдзіне. Раней іх толькі ў акварыўмах бачыла і ў наборах, што прадаюцца, каб пасля прыкладаць да вуха і “чуць шум мора”. І яшчэ некалькі знайшла жывых рапанаў — кінула ў мора

Вучылася рабіць надпісы на пяску і разлічваць інтэрвалы паміж хвалямі — паспяваць напісаць так, каб хваля прыгожа злізала тэкст. Зрабіць надпіс перад хваляй не заўсёды паспяваеш.

І зноў думала пра ілюзіі — яны дапамагаюць жыць на пэўны час, але пасля псуюцца, як малюскі—рапаны ў сваіх ружовых ракавінах, выкінутыя на бераг. Сапсаваныя ілюзіі — харч для варон.

Бераг мора — памежжа стыхіяў.

Ішла ў закатаных джынсах ды ў цяльняшцы па краю мора, і пара — мужчына і жанчына з фотапаратам, відаць, вырашылі, што я мясцовая, запыталіся:

— *Чаму так шмат мёртвых медуз?*

— *Час іх прыйшоў. Можа быць так… Я не ўпэўненая.*

Ці можа медуза ўратавацца? Ці можа не ляжаць нежывой, разлезлай на пяску, а працягваць плаваць, жыць? Ці гэта лёс, прадвызначанасць?

Ну, і google у дапамогу…

Медуза — *ад старажытнагрэцкага Μέδουσα — «абаронца, валадарка». Жыццёвы поспех медуз у тым, што імі ніхто не харчуецца. Само слова медуза паходзіць ад імя старажытнагрэцкай багіні Гаргоны Медузы, валасы якой былі пучком змей. Медуза дыхае ўсім целам. У празрыстым целе медузы — 24 вачэй. Рот медузы — і для ўжывання ежы, і для яе вывядзення. Медуза ў асноўным складаецца з вады, яе жыццё на сушы немагчымае. Калі медузу выкідвае на бераг, яна гіне, высыхае на сонцы.*

Не фатаграфавала мёртвых медуз.

Не фатаграфавала і людзей, якія жылі ў хмызах абляпіхі за цэлафанавай заслонай. Праходзіла, адводзячы позірк, але штосьці ўсё адно назірала. Там былі два мужчыны — адзін паранены ў нагу. Другі ў плячо. Яны выходзілі, калі на беразе мора амаль нікога не было. Адзін з іх — высокі лысаваты, немалады з вайсковай выпраўкай. Я разгледзела яго, калі ён нёс прэсную ваду ў пластыкавых бутлях. Другі быў маладзейшы. Спачатку іх раны былі ў бінтах, пасля бінты змяніла медыцынская “сетка”. Пасля шторму яны зніклі. На месцы іх жытла засталася, занесеная пяском чырвоная куртка.

Калі я распавяла пра іх сваёй прыяцельцы з Адэсы, яна спытала толькі адно:

— *Цікава: яны нашыя, альбо з ДНР?*

І я яшчэ адно прыдумала пакуль хадзіла па беразе: каб не стаць старой медузай, выкінутай на бераг, трэба быць медузай Гаргонай. Медузай, якая выжыла і стала моцнай, і ўсе камянеюць ад яе позірку.

А калі глядзіш па карце на Адэсу— бачыш, што яна патрэбная расейцам. І гэта палохае, трывожыць.

Верасень 2014, Адэса

Люстэркі

Сяброўкі, якіх выбіраем мы, сяброўкі, якія выбіраюць нас, сяброўкі, якіх для нас выбірае жыццё ці лёс.

Ёсць такія, якія ўвесь час "дастаюць", чапляюцца, лезуць падстаўляюць эмацыйныя падножкі. Ёсць сярод іх і "змагары за праўду з мяшчанскім ухілам" (была такая фармулёўка ў 60—ыя гады). Гэта штосьці накшталт хатняга пракурора, ці злоснага следчага.

Абвінавачваюць, вядуць бясконцыя блытаныя маналогі. Гнеўныя шукальніцы праўды. Гаварыць можна ўсё што заўгодна. Галоўнае — зрабіць балюча. Ступень блізкасці і сяброўства вымяраецца болем. У адказ на шчырасць — сама вінаватая і таму будзеш пакараная. Бязлітасныя Эрыніі — дэманы помсты на крылах кажана, з пугаю ды паходняй у руках. З доўгіх вострых языкоў крапае крывя ахвяры. Такія "дзеля праўды" могуць лёгка патэлефанаць мужу сяброўкі і распавесці пра яе каханкаў... Бязлістаныя носяцца ў цемры і асвятляюць сабе шлях паходнямі, каб ніхто не схаваўся. Яны жахліва крычаць, пераследуюць і караюць іншых, тых, хто не такі, як усе. Яны прагнуць зрабіць усіх аднолькавымі. Пачвары. З іх доўгіх языкоў кроплямі падае крывя ахвяраў. Бясконца абвінавачваюць усіх ва ўсім. Ім патрэбныя гледачы і ўвага, і яшчэ — як мага больш людзей уцягнуць у сваю вар'яцкую гульню і пакараць.

І вось, што падказалі мне разумныя людзі, што спыніць гэтыя гульні можа толькі высвятленне крыніцы ўласнага мазахізму. "Крыніца мазахізму" паэтычна гучыць. Але як яе шукаюць?

Але ёсць іншы варыянт, ёсць іншыя сяброўкі, які бачыш можа не так часта, але да якіх можна звярнуцца з любым пытаннем і не адчуць сябе... не адчуць сябе кепска пасля гэтага.

Хачу распавесці пра Кацю. Каця — нашчадак усім вядомага доктар—фізіяёлага, лаўрэата Нобелеўскай прэміі за 1904 год у сферы медыцыны, стваральніка тэорыі пра вышэйшую нервовую дзейнасць.

З Кацяй пазнаёміліся у Адэсе у кватэры яе бабулі. Я зайшла і... адразу ўбачыла люстэрка. Вялізнае, высокае пад столь, а столь кватэры таксама высокая. Пра такія кватэры можна прачытаць толькі ў кнігах пра дарэвалюцыйнае дзяцінства прафесарскіх дзяцей. Я прайшла з вітальні у вялікі пакой, а там яшчэ адно люстэрка. Ручкі на дзвярах старыя — медныя, а на вокнах таксама медныя ручкі. У вялікім пакоі ля сцяны стаяў ровар ён губляўся ўвялікай кватэры, здаваўся зусім маленькім.

Прайшло пару гадоў. Мы сустрэліся з Кацяй у Крыме на пляжы, недалёка ад руін старажытнага Херсанеса. Пачатак кастрычніка.

Бліскучая, блакітнае, празрыстае і спакойнае мора і такое сама блакітанае і ціхае неба. Сонца грэе, мы ляжым на драўляных насцілах і гаворым.

Кажуць, каб супокоіцца траба ўявіць сябе на беразе мора, пачуць шэпт хваляў. Музыка для рэлаксацыі — піяніна, шум мора, чайкі. Не трэба нам піяніна. Не трэба напружвацца і нешта. Мы і так на беразе мора, мы і адчуваем яго пах і лёгкі ветрык, і восеньскі холад, які прабіваецца праз сонечнае цяпло.

— Скажы, ты ў магію верыш... у такую народную, што можно сурочыць і праклясці — чалавека ці дом? — пытаюся я ў Каці.

— Канечне, веру.

— Да ты что!

— А што? Не мушу?

— Ты ж нашчадак вялікага доктара—матэрыяліста. Таму… раз ты верыш, значыць праўда, ёсць яно.

— Так і што? Усе вялікія навукоўцы ўпіраліся ў містыку, розум чалавека абмежаваны

— А як з гэтым змагаюцца? Напрыклад, калі ў доме жыць цяжка

— Наколькі я ведаю ёсць розныя шляхі. Першы — рэлігійны шлях, дом асвяціць, гэта, як чалавека пахрысціць — новае жыццё ў дома пачынаецца. Але, калі ты пра свой дом, пытанне ў тым: у што ты верыш. Мая сяброўка пры цяжкіх адчуваннях, альбо, калі ўсе пачынаюць хварэць, прыбірае ў хаце, мые падлогу з зёлкамі. Я веру, што у кожнага чалавека ёсць магія, і калі ты сама себе рытуал прыдумаеш, які цябе абароніць і чужыя ўплывы прагоніць — ён можа спрацаваць. Ці ёсць у доме старыя рэчы, напрыклад люстэркі?

— Не надта старые… 40—50—ые годы мінулага стагоддзя.

— Я адчуваю энергетыку ад рэчаў, таму, калі мне ад бабулі кватэра засталася, — я найперш люстэркі прадала — яны энергетыку вельмі добра захоўваюць. Перад тым, як кватэру прадаць — я спачатку рэчы прадавала, а то у мяне было адчуванне, што бабуля з кватэры не сыйшла, і што яна бы не дала мне кватэру прадаць.

— Я памятаю гэтыя люстэркі, яны па чатыры з паловай метры вышынёй.

— Так, вялізныя былі — я ўжо не памятаю прадала ці то ў музей, ці то тэатр. А можа і бясплатна аддала.

— Фантастычныя люстэркі былі.

— Ну, гэта не клас, там усяго 4—6 свечак адбівалася, а класныя лічацца пасля 10—12 адбіткаў.

— А ты адлюстроўвала ў люстэрках свечкі?

— Вядома, запалі свечку і паднясі да люстэрка, у сучасным люстэрку ты убачыш 1—2 адбіткі. А старыя люстэркі — тоўстыя, там больш пераламленняў адлюстравання выявы.

— А што для гэтага свечку ставіць насупраць люстэрка ці як?

— Свечку ставіш перад люстэркам, а глядзіш троху збоку, як бы ў перспектыву…

— Я праверу калі застануся вечарам адна ў доме. Можа нават перад Дзядамі — днём ушанавання памерлых.

— Так… вяртаемся да твайго дому — мне здаецца, гэта пытанне кошту, які ты сама заплаціш. Калі ты маеш магчымасць паўсюль змяніць падлогу і абнавіць сцены — гэта дапаможа. Гэта не кансультацыя, гэта парада з практыкі.

— Я так думаю, што ад дому, у якім нарадзіўся і жыў у дзяцінстве трэба трымацца далей. З'ехаць куды—небудзь і заязджаць зрэдку, а яшчэ лепей у снах. Я табе таксама распавяду гісторыю пра раптоўную смерць жанчыны і люстэрка… Распавялі ў цырульні… Адбылася гіторыя ў раённай паліклініцы імя Сямашкі, дзе паставілі новыя камеры—назіральнікі. І здарылася, што адна жанчына ішла па лесвіцы ў паліклініцы і памерла. Супрацоўнікі пагледзелі гэта ў запісу і ўбачылі наступнае — ідзе жанчына па лесвіцы, а за ёй нешта цёмнае — ці то цень, ці то пляма цягнецца. Жанчына падае, гата цёмнае аддзяляецца ад жанчыны, пачынае мітусіцца, а пасля шугае ў люстэрка. Запіс з камеры паказалі галоўнаму доктару, ён сказаў люстэрка замяніць і запрасіць святара. А размова пачалася з таго, Што "камеру не падманеш".

— Новая гарадская легенда.

Каця пазбылася ад сваіх люстэркаў, прадала кватэры ў цёплай Адесе і з’ехала ў Пецярбург, дзе працуе ў арганізацыі, якая займаецаа экспертызай старых будынкаў.

Дом, як дамавіна. Гэта аднакарэнныя словы — так? Калі мы клапоцімся пра захаванне старых дамоў, можа гэта не зусім пра архітэктуру, можа мы дбаем пра прывіды, каб ім было дзе існаваць.

І яшчэ кажуць, што сапраўдных сяброў чалавек можа знаходзіць толькі ў юнацтве. І тыя, што з юнацтва яны сапраўдныя. Няпраўда, чалавек можа знаходіць новых добрых сяброў у любы момант свайго жыцця.

Красавік 2012

Субота

— Валя, што мы будзем сёння есці? Валя, звары супчыку! — просіць Лена, пачынаецца новы дзень ў 548 пакоі ў інтэрнаце нумар чатыры па праспекце Машэрава ў Менску. У інтэрнаце жывуць філолагі і юрысты Беларускага дзяржаўннага ўніверсітэту імя Леніна.

“Які супчык зранку? Яны здурнелі, здекуюцца — думаю, — не даюць спаць, а ўчора ўвечары не давалі чытаць, абзываліся “аспіранткай”, скінулі настольную лямпу, яна перастала гарэць”.

Вокны шчыльна занавешаныя, у пакоі шэрае каламутнае святло, брудныя міскі на стале і чорны жаночы капялюш сярод іх.

Валя ўстае, робіць некалькі крокаў, трапляе ў кампотную з яблыкамі лужыну.

— Звары супчыку…

Сонная Валя са ўчорашнім супам цягнецца на кухню, тапкі ліпнуць да падлогі, даводзіцца мыць падэшвы пад кранам у агульнай умывальні ў канцы калідору.

Лена ўключае маленькі чорна—белы тэлевізар з антэнай, узяты на пракат. Тэлевізар шыпіць.

Пакідаючы мокрыя сляды на каменнай падлозе, Валя вяртаецца ў пакой, дзе Лена ўжо глядзіць фільм, — таксама ўчорашні, як і супчык, — паўтор.

Адчыняюцца дзверы, заскокваюць суседкі:

— Вы ўжо ўсталі. А цыгарэты ёсць?

— Няма.

— А можна кіно паглядзець?

— Глядзіце…

З калідора даносяцца пахі. Хтосьці ўжо смажыць зранку сала. Пачатак сакавіка, Вясна, ужо пацяклі ручаі па асфальце, паказалася на газонах леташняя трава прымятая і парыжэлая, як поўсць. Вецер расчыне фортку.

Валя нясе супчык, тапкі зноў ліпнуць і зноў іх даводзіцца мыць. Суседкі, якія прыйшлі па цыгарэты і засталіся глядзець фільм, пачалі нешта шукаць у пакоі: адна пад ложкам, другая ў шафе, трэцяя ў маёй шуфлядцы.

— Вы штосьці згубілі?

— Кансэрву, — адказвае за суседак Лена.

Тыя ж злосна маўчаць і не губляюць надзеі знайсці кансэрву.

— Ці не бачыла ты бляшанку? Гавораць, была ў іх, калі прыйшлі да нас кіно глядзець, — Лена гаворыць так, быццам бы не з’ела яшчэ

ўчора тую кансэрву. Пошукі працягваюцца. На экране тэлевізара — вайсковая драма — фашысты б'юць па твары жанчыну.

Вясной хочацца на вуліцу, вясновы вецер, прага пераменаў. Іду гуляць адна — без сяброўак. Гуляць — на могілкі.

Плывуць празрыстыя хмары над Кальварыйскімі могілкамі, крычаць вароны ды іншыя вялікія птушкі, здаецца, сарокі з зялёнымі хвастамі скачуць па надмагіллях. На паваленым дрэве сядзяць жанчыны, адна трымае вялізнага шэрага ката.

— Вы не скажыце, колькі цяпер часу? — пытаюся ў іх.

— Не скажам, бо не ведаем.

— А які ў вас кот прыгожы!

— У нас не кот, а котка: ёй ужо сем месяцаў.

А ў вечары ў сутарнні чацвёртага інтэрнату па вуліцы Машэрава — дыскатэка, б'ецца музыка ў цесных калідорах. Ладзяць дыскатэку юрысты — былыя воіны—інтэрнацыяналісты з Афганістану. Галоўны на дыскатэцы — былы воін з прозвіўчам, як у канцлера Вялікага Княства Літоўскага. І дыскатэка ў сутарэнні мне нагадвае пекла.

А ў пакоі пакоі нумар 548 — супакой. На стале ўжо няма чорнага капелюша, а стаіць букет ружаў у трохлітровы слоіку, і нікога няма, толькі стаіць пасярэдзіне таз, а ў ім белая з зялёнымі плямамі на крылах курыца. Навошта яна тут? Калі варыць з яе супчык, то трэба забіваць. А хто ж у нас гэтым займацца будзе? І няма нікога, паразбягаліся…

Цёмна ў пакоі, і музыка сціхла ўжо. Адсоўваю таз з курыцай падалей ад свайго ложка, куруца хвалюецца, б'е крыламі, пратэстуе.Глядзіць на мяне круглым жоўтым вокам. Праз вакно з вуліцы свеціць ліхтар.

У цемры букет ружаў на стале пачынае пахнуць мацней. Кветкі ў адбітках ліхтаровага святла нагадваюць істот неспазнанага, змрочнага свету. А адкуль кветкі? Гэта ж Лена збіралася на вяселле ехаць. Чаму кветкі не забрала і Валі няма, і курыца нейкая з плямамі зялёнымі на крылах, а сама белая. Робіцца непамысна. Запальваю святло, падыходжу да курыцы, крышу ёй хлеба. Яна пачала была дзяўбсці, але раптам кінула і зноў утаропілася на мяне круглым усхваляваным вокам. Што ёй трэба? Доўга я сядзела з нагамі на сваім ложку, гарэла святло, курыца была, як не жывая: і не варушылася, і хлеб не дзяўбла. Хацела даць ёй вады, але ўжо страшна было падыходзіць.

Радзела цемра, прабівалі шчыльны туман праменні сонца, калі курыца выбралася з таза і пайшла да дзвярэй. Я паціху адчыніла дзверы і хуценька захлопнула іх, як толькі курыца апынулася на

калідоры. Адразу зрабілася лёгка, можна было спаць. Прыехала ад сястры Валька, увалілася ў пакой з торбамі, а ў торбах яблыкі і каўбаса.

— Прывітанне! Што ты сядзіш такая? Дзе Ленка?

— Яна ж на вяселле паехала.

— Паехала? А во ж яе кветкі, і сукенка яе вісіць.

А я ўжо бачыла і Ленкіны боцікі, і яе новую чырвоную сумку. Не ўехала Ленка. Я выбегла на калідор, паўсюль, дзе толькі можна шукала белую з зялёнымі плямамі курыцу. Шукала і не знаходзіла, яна згубілася ў калідорных лабірынтах. І калі ўлічыць, што дом пяціпавярховы, а на кожным паверсе па дзве кухні, то лепей не думаць аб яе далейшым лёсе. Я стаяла ля вакна, сцякалі па шклу кроплі, ішоў дождж, змываў апошнія рэшткі снега. Тхнула дэзынфекцыяй, труцілі мышэй, клапоў і тараканаў. Праз туман выступалі стромкія вежы былога касцёла, спяшаліся некуды людзі з рознакаляровымі парасонамі. Вярнулася ў пакой, а там ужо дзікая качка білася крыламі ў шыбу, яблыкі раскаціліся з торбы. Я адчыніла акно і згубілася ў тумане дзікая качка. На кухні рабілі рамонт, аббівалі са сцен старую кафлю, кафля падала на падлогу і білася, як нашы цьмяныя надзеі. Стук кафлі і пах дэзынфекцыі даймалі да немагчымасці. Навошта я іх павыпускала? Можа б яшчэ зрабіць нешта можна было?

“Клапы—тараканы не турбуюць?”, — калі ў пакой зазірнулі жанчыны ў белых халатах, толькі сухі дубовы лісток ляжаў на падлозе. Яго можна было б вынесці на двор, але ўсё заліў раствор дэзынфекцыі. Рыпела адчыненае акно, ў ім была дзірка, як ад кулі.

23.03.1987

На вакзале

Юрасю здавалася, што яго сустракаюць. Ён марудзіў на платформе, у падземным пераходзе пільна ўглядаўся ў твары людзей, што стаялі ўздоўж сцяны. І нават на аўтобусным прыпынку Юрась азіраўся, шукаючы некага вачыма.

Было холадна. Вецер гнаў сыпкі снег, намятаў гурбы. Круцілася, пералівалася рознакаляровымі агеньчыкамі ёлка на прывакзальным пляцы.

У кватэры Юрася сустрэў кіслы, застаялы пах нежылога памяшкання. І Юрась, не распранаючыся, кінуўся адчыняць форткі: "Хай сабе скразняк, абы не гэты пах", — думаў ён, ужо здымаючы пажоўклыя газеты з кніжных паліц. Уключыў у разеткі тэлевізар і халадзільнік і сеў задаволены ў крэсла. Нарэшце, дома, праўда, ненадоўга, але ўсё ж такі… У сваёй кватэры Юрась адчуваў сябе вольным, ад чаго — сам толкам не ведаў.

У дзверы пазванілі. Юрась пайшоў адчыняць, але спыніўся. Відаць, нехта памыліўся. Каму трэба званіць у пустую кватэру? Але званілі доўга і настойліва, не адрываючы рукі. Юрась мусіў адчыніць. На парозе стаяла дзяўчына ў чорным футры.

— Праходзьце. Я сам толькі што прыехаў, яшчэ нічога да ладу не давёў, — тлумачыў ён, дапамагаючы ёй распранууцца, і ўсё не мог згадаць — што гэта за дзяўчына. Ён правёў яе ў залу, пасадзіў у крэсла, дзе толькі што сядзеў сам.

— Марыя Вітольдаўна памерла, — прамовіла дзяўчына.

— Гора якое! Калі? — сказаў Юрась толькі дзеля таго, каб нешта сказаць і выгадаць час, бо зусім не памятаў, хто такая Марыя Вітольдаўна.

— Сёння днём, — адказала дзяўчына і заплакала.

Юрась паківаў галавой: ён усё ж прыгадаў, што Марыя Вітольдаўна — яго швагерка, а дзяўчына, відаць, яе ўнучка Вера.

— Яшчэ сёння глядзела, як я шары на ёлку вешала, — гаварыла Вера скрозь слёзы. — Але, ведаеце, цяпер свята, дык усе крамы пазачыненыя і кантора гэтая… Вы, Юра, прыйдзеце заўтра?

— Я заўтра ад'язджаю. А то прыйшоў бы. Я магу зранку падысці да маёй цёці. Яна дакладна прыйдзе.

Юрасёва цётка жыла на другім канцы горада, Юрась адчуў, што, схадзіўшы туды, ён ужо зробіць добрую справу. Вера пайшла. Але спакой быў парушаны. Юрась без мэты блукаў па кватэры, разглядаў змалку знаёмыя карціны на сценах, браў з паліц кнігі толькі

для таго, каб паставіць іх на месца. Было прыкра і цяжка. Юрась падышоў да акна. Глядзеў, як вецер бесперастанна круціў дробны, сухі снег у чорным вечаровым паветры. У акне насупраць успыхнула ліхтарыкамі ёлка. “І мне трэба было б хоць якіх лапак у слоік паставіць. А то які ж Новы год, а тут яшчэ гэта... — думаў Юрась. — Я ж Марыю Вітольдаўну можа раз у жыцці бачыў — заносіў ёй вазоны, каб летам кветкі палівала”. У памяці ўсплыла думка, якая калісь вельмі турбавала Юрася: “Чаму чалавек ніколі не можа адчуць ці хаця б уявіць чужога гора, болю? Ніколі. А калі ён прыходзіць, агортвае цябе, ты, адарваны ад усіх, застаешся з ім сам—насам, пазіраеш на свет, бы з глыбокай студні”...

Спаў мала і неспакойна, думкі пераліліся ў трывожныя сны: то бітыя вазоны з высыпанай зямлёю, то калядная каза бегала па кватэры і біла капытамі.

Раніцай пацішэла. Замятуха скончылася, паказалася сонейка. Юрась павольна ішоў ціхай старой вуліцай на ўскраіне горада, уздоўж аднапавярховых дамкоў з чырвонай цэглы. Пры яго набліжэнні з дрэў узляталі сініцы, атрэсваючы з папрыгінаных галін снег. Сняжынкі зіхацелі, пераліваліся на сонцы. Юрась усміхаўся, ён прыгадваў той час, калі ездзіў сюды кожны дзень пасля школы. Яго цётка вельмі любіла і пеставала катоў. У яе заўсёды было іх не менш пяці, акрамя гэтага каля яе дома збіраліся прыблудныя і суседскія каты, якіх яна таксама час ад часу прыкармлівала. А ўласна хатнія мелі на дзіва дагледжаны выгляд: тоўстыя, пухнатыя, з бліскучай поўсцю. Нават да цёткі яны не адчувалі ніякай удзячнасці: ні за сырызну, ні за супы, ні за цёплую печку. Юрась знаходзіў на печцы сабе пацеху: ён асцярожненька праводзіў рукой па тлустых каціных спінах, тады па хвастах, дакранаўся пальцам да вільготных насоў. Каты злосна пыхцелі, білі хвастамі, паказвалі вострыя кіпці з—пад пульхных падушачкаў на лапах.

— Юра, што ты робіш з маімі катамі? — крычала цётка.

— Што ж ты ім такім зробіш? — смяяўся Юрась.

Потым прыходзілі бацькі і забіралі Юрася, каты скручваліся ў клубок, вярталіся да звыклага спакою на цёплай печцы. З такімі ўспамінамі Юрась падышоў да цётчынага дома. Брамка была зачынена, і ён пагрукаў у акно. За фіранкаю прамільгануў цень.

— Юра! А няўжо гэта ты? Зусім ты на мяне забыўся!

Цётка выбегла на двор, адчыніла брамку і зараз цягнула Юрася ў хату, не даючы сказаць слова.

— Сядай во сюды, да акенца, распавядай, — казала яна.

Юрась сеў, тужліва глянуў на заснежаныя дрэвы і прамовіў:

— Марыя Вітольдаўна памерла.

— Гора якое! А калі?

— Учора днем. Яшчэ зранку глядзела, як Вера шары на ёлку вешала, днем стала кепска і ўсё.

Цёткаківала галавой.

— Ты пойдзеш да іх? — спытаў Юрась.

— А як жа я, Юра, пайду? Да мяне зараз госці прыйдуць. Я пірагоў напякла. Можа і ты есці хочаш? — усхвалявалася цётка. Юрась спакойна адказаў: “Хачу”. І сам сабе падзівіўся, бо прыйшоў усё ж такі паведаміць аб смерці.

Яны селі за стол. Юрась зноў каля акна, а цётка насупраць.

— І калі ты, Юрась, скончыш свой інстытут?

— Яшчэ год вучыцца.

— А тады?

— А тады буду працаваць.

— А дзе?

— Хто ж ведае, куды накіруюць. А як, цётка, тваё каты? Колькі іх у цябе?

— Тры.

— Нешта мала!

— А паглядзі якія.

На печы Юрась знайшоў толькі аднаго ката. Ён ляжаў выпраставўшыся, як дарагі каўнер, і не падаваў ніякіх прыкмет жыцця. Юрась правёў рукою па яго спіне, па пухнатаму хвасту, дакрануўся пальцам да носа. Патурбаваны кот злосна мяўкнуў, скруціў дугой хрыбціну.

— Юра, што ты яму зрабіў? — закрычала цётка, пачуўшы мяўканне.

— Хіба яму што зробіш?

Юрась саскочыў з печкі.

— Добра, я пайду. Вы, можа, ўсё ж такі сходзіце да Веры?

— А ты пойдзеш?

— Я ж сёння ад’язджаю.

На вакзале Юрась паспрабаваў уявіць, што яго праводзяць, але не здолеў.

1987 год

Белая поўня

Слава любіла Рыгорку, калі ён маўчаў. Тады можна было глядзець у вакно і ўяўляць, што Рыгорка не існуе. Проста не існуе ў прыродзе. Так прыемна было глядзець на шашу, на цёмны лес. Рух і мігценне агнёў на шашы заварожвалі, а над лесам узыходзіла белая поўня. Калі Рыгорка гаварыў, месца для фантазіяў не заставалася.

— Слава! Слава, ты мяне слухаеш?

— Слухаю!

— Ты мяне добра слухаеш?

— Лепш за ўсіх.

— Слава, мы будзем займацца з табой бізнесам!

— Я не хачу бізнесу.

— А што ты хочаш? Як наогул ты збіраешся жыць? Ты толькі паслухай мяне, табе гэта спадабаецца.

З чырвонай папкі Рыгорка выцягнуў зашмальцаваную кнігу без пераплёта, разгарнуў і пачаў чытаць. Чытаў, як заўсёды павольна, расцягваючы словы амаль па складах. "Калі чорны певень пражыве сем год, то ў канцы сёмага года знясе яйка. Гэтае яйка трэба трымаць у цяпле і насіць увесь час з сабою. Тады вылупіцца з яго маленькі цмок. Цмока трэба гадаваць, ніколі не нерваваць і карміць яешняй. Цмок выгадуецца, навучыцца лётаць і будзе адшукваць скарбы, прыносіць свайму гаспадару золата і грошы. Усё! — Рыгорка скончыў чытаць, — Зразумела?".

— Ты хочаш набыць чорнага пеўня, каб праз сем год ён знёс яйка?

— Дурная! Чорны певень сем год жыў у маёй маці, ён ужо знёс яйка, і яно ў мяне. Праз месяц вылупіцца цмок!

— Яшчэ скажы, што будзеш цэлы месяц насіцца з яйкам, як курыца!

— А я даручаю гэта табе…

— А я не буду!

— Слава, ты падумай: мы выгадуем цмока, і ён пачне насіць нам скарбы!

— Я думаю: я выгадую цмока, і ён пачне насіць табе скарбы.

— О, Божа, Слава, я паважаў цябе за шчырасць, я думаў — ты любіш жывёлін… А ты, ты, да ты ведаеш?.. Ты яшчэ горш за усіх іншых… Ладна, хай будзе так: ён нікому не прынясе нічога.

Рыгорка выцягнуў з кішэні прадмет, які зусім мала нагадваў яйка — чорная закручаная чарупіна з дробнымі светлымі плямкамі.

Выгляд чарупіна мела далікатны і вельмі крохкі. Рыгорка падкінуў яе некалькі разоў на далоні.

— Зараз выкіну праз вакно… — Рыгорка кінуў на Славу хуткі позірк, размахнуўся і на нейкі момант знерухомеў у дэманстрацыйнай позе. Слава глядзела на Рыгорку. Бачыла — чарнявага хлопца спартовага тыпу з пакатымі плячыма, светла—шэрымі выцвілымі вачыма, прамым носам і жорсткім ротам. Хлопец гэты стаяў з выцягнутай рукой, рабіў выгляд, што зараз шпульне ў вакно чорны прадмет — увасабленне сваіх даўніх мараў. Шпульне, праб'е вакно на варыўні, разаб'е свае блакітныя мары.

— Чакай, — Слава затрымала Рыгоркаву руку, — дай сюды.

Чарупіна нечакана аказалася цёплай, амаль гарачай. І Слава зразумела, што цяпло ідзе адтуль, з сярэдзіны, ад схаванай пад чорным шкарлупіннем істоты.

— Мы выгадуем цмока! — сказаў Рыгорка. — Толькі не салі яму яешню.

“Добра, а калі гэта жарт?” — думала Слава на працы. Яна была мастачкай у архітэктурна—археалагічным атрадзе “Верхні горад”. Яйка ляжала ў яе левай кішэні. Рыгорка любіў жартаваць. Падабраў дзе—небудзь у пяску на будоўлі камень — выкапнёвага смаўжа і падсунуў ёй. Яна будзе месяц цягаць яго ў кішэні, звыкнецца, паверыць, што вылупіцца цмок, будзе чакаць. А ён прыйдзе з сябрамі і скажа: “А зараз Слава пакажа нам, што ў яе ў кішэні.” І ўсе будуць смяяцца. Ці ж гэта першы раз? Проста — новая пастка. Слава замалёўвала кафлю — прыгожую паліхромную, знойдзеную летам пры раскопках замка. На кафлі два чалавечка трымаюцца за рукі. “Шляхціц з паненкаю менуэт таньчаць”, — сказала пра кафлю Валянціна Браніславаўна, кабета, якая сядзіць са Славаю ў адным кабінеце. Валянціна Браніславаўна любіла пагаварыць са Славаю на тэмы філасофскія.

Слава замалёўвала кафлю і ўяўляла замкавую залу з вялізнай цёплай печкай — шэраг паліхромных шляхціцаў з паненкамі таньчаць менуэт, ля столі.

Цёплая чорная чарупіна ляжала ў левай кішэні.

— Слава, — сказала Валянціна Браніславаўна, — як Вы ставіцеся да такога выказвання: чалавек — гэта тое, пра што ён думае на працягу дня?

— Не ведаю, — Слава паціснула плячыма, — можа быць так яно і ёсць. На працы Слава любую фразу пачынала словамі “Не ведаю” і заўсёды паціскала плячыма. — Я не захапляюся цытатамі.”

— Мне гэта нецікава, — так Слава пачынала тэлефонныя размовы з Рыгоркам. — Мне нецікава, калі ты прыйдзеш дахаты… Калі заўгодна… Добра, я зраблю табе амлет, калі прыйдзеш. Толькі не тэлефануй болей. Усё… Пакуль.”

Слава паклала трубку. Вось так. Шэрая, мокрая восень. У кватэры яшчэ не ўключылі ацяпленне — холадна і сумна. Так, сем год гадавала чорнага пеўня Рыгоркава маці. Сем год таму Рыгорку было дваццаць два гады, і ў гэтым узросце ён задумаў выгадаваць цмока. Ці гэтага захацела маці? Нядрэнна — цмок да канца жыцця будзе насіць яе любімаму сыночку скарбы. А Слава? Сем год таму вучылася ў восьмым класе, займалася валейболам, хадзіла на трэніроўкі. Яна не збіралася гадаваць цмока. Усё так брыдка і нудна, ні на што не стае моцы. Слава не магла знайсці сабе месца, не пакідала адчуванне страты — быццам згубіла што. Ці хутчэй не згубіла, а проста ўкралі. Толькі што? Чорная чарупіна на месцы, ляжыць у кішэні і грэецца. Ці грэе? А Славе здаецца, што яна ўжо перастала быць сама сабой: рукі і ногі нямеюць, як чужыя, вочы круглыя, пагляд палахлівы. І застаецца адно — пашкадаваць сябе. Усё такі заўсёды застаецца месца для жахлівага, і абавязковае месца — для пакарання. Прыціхлі ў змроку цені жаданняў, якія немагчыма ператварыць у цярпенне, дзіўныя намеры шчэмяцца ў душу. І спынілася ў вышыні белая поўня.

Цмок вылупіўся ўвечары, калі Рыгоркі не было дома. Слава думала, што цмок будзе падобны на вужаку. Але не, малы ён нагадваў яшчарку, а калі падгадаваўся, дзіўным чынам змяніў аблічча — зрабіўся падобным на сабаку. Слава праводзіла з ім шмат часу, карміла яешняй, мыла і называла Крыланам. Яна звыклася з яго вострай мордаю з чорным носам і маленькімі бліскучымі вачыма, звыклася з тым, што замест пярэдніх лапаў у яго крылы. Рыгорка забараняў называць цмока Крыланам.

— Гэта Цмок — і ўсё!

— Ён занадта тоўсты для Цмока.

— Ён нармальны, такі як трэба. Гэта ты тоўстая.

Рыгорка паглядзеў уважліва на Славу, пасля на цмока і дадаў: “Хутка будзеш вучыць яго лётаць”. Крылан большасць часу хаваўся за лядоўняй, усяго баяўся, і Слава сумнявалася, што ён калі—небудзі паляціць.

Славу цікавіла ўсё, што тычылася выхавання цмока. Калі Рыгоркі не было дома, яна шукала кнігу, якую не бачыла ні разу з таго

самага першага дня. Знайшла яе, бо вельмі хацела знайсці, на шафе, загорнутую ў паперу, зверху на кнізе стаяў прас — стары і цяжкі, ім ніхто не карыстаўся. Пра гэты прас Рыгорка казаў, што яго падаравалі маці на вяселле.

“Цмок нікому не паказваецца. Кожны дзень гаспадар ці гаспадыня носяць яму свежую яечню. Але яечню нельга саліць, пасаліўшы яечню — угнявіш цмока. За гэта ён спаліць усе скарбы, гаспадара і ўляціць”, — прачытала Слава ў кнізе.

Субота. 21 снежня. Даўж. дня: 6.57. Поўня — падкрэсліла Слава ў перакідным календары, што ляжаў на яе працоўным стале. Сёння Рыгор збіраўся выпускаць цмока, сказаў, што скіне яго з балкона — пара ўжо. Крылы мае — значыць паляціць.

— А як Вам, Слава, здаецца, — спытала Валянціна Браніславаўна. — Што лепей: быць паслухмяным ці заўсёды кіравацца сваёй воляй?

— Галоўнае — ведаць правілы.

— Што?

— Прабачце, я не ведаю, Валянціна Браніславаўна.

“Самая бязглуздая гульня мае сэнс, калі ведаць правілы”, — сказала Слава сама сабе ўжо на вуліцы і ўсміхнулася. Як на цуд глядзела яна на зіхатлівы, парушысты снег у святле ліхтара. Снег нагадваў ёй тоўчаныя шкельцы на калядных паштоўках, якія дасылала ёй бабуля з Амерыкі. Хутка каляды. І, здаецца, на пустой вуліцы ўжо пахне елкаю і мандарынамі. Мяккімі аранжовымі мандарынамі. На высокім небе мігцелі чыстыя, халодныя зоркі, каціласа над горадам сумная поўня. І падала знічка. “Памёр нехта”, — паспела падумаць Слава. Але знічка не ўпала, шугаючы зыркім полымям, праляцела над Славаю і скіравалася на ўсход, туды, дзе канчаўся горад. Туды, куды трэба было ехаць і Славе. Спачатку на метро, потым аўтобусам, амаль гадзіну. Пакідаючы за сабой доўгі залаты след, вяртаўся дадому выгадаваны Славай Цмок—Крылан. Матэрыялізаванае Рыгоркава жаданне.

“Галоўнае — не спяшацца ў дзеяннях, — падумала Слава, — пасаліць яешню я паспею заўсёды. Набліжаліся каляды, а гэта было любімае Славіна свята. Самае вясёлае свята.

Лістапад 1992 год

Да сустрэчы ў Сінгапуры!

— Бамбёжка! — сказала Ленка.

Металёвыя кляшчы ўздымалі ў паветра і ставілі на машыну кантэйнеры са смеццем. Кантэйнеры грукалі і ляскалі.

— Бамбёжка! — сказала Ленка. А Янка, лежачы ў ложку, уявіла цяжкі смурод, што распаўзаўся зараз ад кантэйнераў. Пасля іх на асвальце звычайна застаюцца мокрыя пляміны, якія высыхаюць за дзень, а вечарам зноў выразна адчуваецца пах новай працоўнай раніцы. І так штодня.

— Бамбёжка, — паўтарыла Ленка і пайшла на працу. Янка зноў заснула.

Янка прачнулася, калі паміж высокімі дамамі распаўзліся прыцемкі, канчаўся восеньскі дзень. Янка пасунулася на кухню, папіла вады з—пад крана, запаліла цыгарэту. Цыгарэта пакідала на вільготных вуснах непрыемны смак, і Янка заела яе малінавай сочвай. Па радыё перадавалі джазавую музыку. Думкі распаўзаліся, што тыя пляміны на асфальце, перад вачыма круціліся знаёмыя твары, дамы, вуліцы, парканы з перадвыбарчымі клакатамі. Усё круцілася, круцілася, але хвалявала не больш ад пустой пляшкі, пушчанай на рачныя хвалі.

Янка ўзяла кніжку, але чытаць не магла. Пачаўся дождж, яна сядзела і слухала яго нервовы рытм.

У дзверы пазванілі, гэта прыйшоў Жэнік.

— Ты адна? А дзе Ленка?

— Не ведаю… А дзе твой парасон?

— Які парасон?

— Ты без парасона? На вуліцы ж дождж.

— Які дождж?!

— Хіба не чуеш, як шуміць?

— Шуміць? Гэта галубы топчуцца па карнізе.

— Галубы ўжо спяць.

Аранжовая лямпа напаўняла пакой роўным нязыркім святлом. Дождж падаў за вакном, буйныя кроплі біліся аб цынкавы карніз. Жэнік плюхнуўся на канапу і сказаў:

— Жыццё такое дурное…

— Жыццё дурное, — паўтарыла Янка. — Але апошнім часам у мяне пачынае ўзнікаць сумненне: ці гэта жыццё дурное, ці ўсё ж такі я дурная.

— Чаго?

— Мне нядаўна распавялі трагічную гісторыю пра каханне, я рагатала, не магла супакоіцца.

— Раскажы.

Жэнік выцягнуў з вазы засушаны гваздзік і па адным абдзіраў яго пачарнелыя пялёсткі.

— У гэтай дзіўчыны быў хлопец. Літовец. Вельмі разумны. Разбіраўся ў філасофіі, вучыўся ў політэхнічным інстытуце. Яны цалаваліся на вуліцы.

— Гэта ўжо натуралізм, — Жэнік выцягнуў з вазы яшчэ адзін засушаны гваздзік.

— Так, але гэта яшчэ не ўсё. Ёй казалі, што ў яго шмат “дзяўчат”, але яна “не верыла”.

— Чаму?

— Не ведаю. Аднойчы вечарам яна ішла па вуліцы і пабачыла, як ён у падваротні цалуецца з іншай дзяўчынай. Яна падышла і сказала па—руску: “Девушка, не верьте ему, он вас обманет!”. А мужчына сказаў: “А, прывітанне, і ты тут?” Клас?

Жэнік засмяяўся і сказаў, што ва ўсім гэтым выразна праглядаюцца фальклёрныя матывы, што сюжэт гэты можа спакойна вандраваць ад адной трагічнай гісторыі да другой. Але ўсё роўна смешна.

Янка пайшла на кухню гатаваць каву. Пакуль грэлася вада, яна глядзела ў вакно. Было цёмна, густы дождж барабаніў у шыбу. Двор быў пусты, белыя ліхтары свяціліся ў халодным змроку. Чорныя вадзяныя патокі несліся па асфальце да закратаванага люку. Вада каля люку віравала, у віры круцілася нешта белае, як падалося Яне, ануча.

“У кагосьці бялізну з балкона знесла”, — падумала яна. Праз двор да тэлефона—аўтамата прабегла жанчына ў светлым плашчы. Можа, “хуткую” трэба выклікаць? Пры такім жахлівым надвор’і каму хочаш можа зрабіцца блага. На кухні пахла кавай. Жанчына ад тэлефона вярталася да свайго пад’езда. Каля люка яна крыху памарудзіла. Хацела пераскочыць? Кава закіпела, вылілася на пліту. Янка хуценька выключыла газ. І калі зноў глянула ў вакно, жанчына знікла, толькі у віры над люкам вада круціла нешта светлае. Дождж шапацеў, заглушаў усе іншыя гукі. Янка, якая заўсёды сумнявалася ў рэальнасці навакольнага свету, не знайшла ў гэтым здарэнні нічога дзіўнага. Разліла па філіжанках каву і панесла яе ў залу.

На сцяне была налеплена паштоўка: заснежаны пляж, мол, халоднае мора.

— Што гэта? — спытаў Жэнік.

— Мой любімы краявід.

Паштоўка вісела на сценцы даўно, таму ніхто ніколі не мог бачыць надпісу на яе адваротным баку. “Да сустрэчы ў Сінгапуры…” — было напісана там. Янка заўсёды помніла пра гэта, калі глядзела на любімы краявід, то паўтарала ў думках: “Да сустрэчы ў Сінгапуры… Да сустрэчы ў Сінгапуры…” Гэту фразу можна было прагаворваць на розныя лады, у залежнасці ад настрою.

— У мяне таксама ёсць любімы краявід, — гаварыў Жэнік. — Рэклама для насовак: сонца заходзіць, а на скале стаяць чырвоныя сосны, пад імі чорныя цені. Ён у мяне дома ў кнігах ляжыць.

— Чаму ты яго не дастанеш?

— Навошта? Гэта ж толькі рэклама на насоўкі.

Жэнік пайшоў, Янка зноў засталася адна. Яна стаяла з цыгарэтай каля вакна на цёмнай кухні. Бачыла, як Жэнік выйшаў з пад’езда. Ліў дождж, а ён не заўважаў на яго, як бы дажджу не было зусім. Бачыла, як Жэнік на хаду азірнуўся, глянуў на іх вокны, махнуў рукой і знік. Гэта было каля таго люка. Янка стаяла, глядзела на дождж, больш глядзець не было на што — двор быў зусім пусты. Свяцілі белыя ліхтары.

— Да цябе Жэнік прыходзіў, — сказала Янка Ленцы, калі тая вярнулася дахаты.

— Што ён хацеў?

— Не ведаю… А дождж яшчэ ідзе?

— Скуль ты ўзяла? Суха. А з Жэнікам мы ўсё роўна пабачымся заўтра.

— Магчыма.

Янка глядзела на свой любімы краявід: мора, мол, зярністы снег на пляжы. Яна падумала, што Ленка таксама не ведае таго надпісу на адваротным баку паштоўкі:

“Да сустрэчы ў Сінгапуры…”

1989 год

Цэгла

У лістападзе выпаў сьнег. Шмат сьнегу... Дзеці павыцягвалі на вуліцы лыжы і санкі, але дарма — сьнег хутка растаў, сплыў у ліўневыя стокі. Шчыльны туман падняўся над горадам. Верхні горад рыхтаваўся да рэстаўрацыі. Дамы пакрыліся чырвона—брунатнымі плямамі архітэктурных зондаў. Я ведала: у шчылінах паміж цаглінамі хаваюцца павукі, там зімовыя павучыныя гнёзды. Зонды выкрывалі зьмены, якія перажывалі дамы, пераробкі і пераўтварэньні, схаваныя пад тынкоўкай. Зьменаў хапала: на месцы дзвераў узьнікалі вокны, на месцы вокнаў — дзьверы, замест брамы — глухая сьценка. У той час я сябравала з надзвычай разумнай дзяўчынай — Наталькай. Мы працавалі разам: малявалі дом, адзначалі зонды, мералі цэглу. Лажок, тычок, шырыня швоў, колер... Старая цэгла мусіла расказаць праўду пра будынак, праўда спрыяла рэстаўрацыі. Мы мералі цэглу, цэгла мацавала наша сяброўства. Застаецца толькі ўспомніць...

Вузкая брукаваная вуліца ўзбягае ад ракі да ратушнага пляцу. Ратушы даўно няма, ёсьць толькі спадзяваньне, што яе адновяць. Я малюю ружовы дамок на вузкай вуліцы, якая калі—небудзь прывядзе да ратушы. Туман цёплы, а рукі мерзнуць — ад цэглы. Туман густы, у некалькіх кроках улева і ўправа — нічога не разгледзець. Затое ў ружовым доме на першым паверсе гарыць сьвятло. Праз запацелае шкло бачу стол з рэшткамі сьняданку, венскае крэсла з тлустым катом (коткі, звычайна, не бываюць такімі вялікімі). Хутка, зусім хутка гэтаму прыйдзе канец: з’едуць гаспадары, расхістанае крэсла стане здабыткам бомжаў, здзічэе кот. Прыйдзе зіма, выб’юць вокны ў дамах, на засыпаных сьнегам вулках з’явяцца сьляды бомжаў, дзікіх катоў і птушак. Каты будуць лавіць птушак.

— Я ўжо ўсё зрабіла, — каля мяне з’яўляецца Наталька.

— Дзе ты была?

— Недалёка. Ты ня бачыла мяне, бо туман.

Разам мераем цэглу, Наталька дапамагае мне. Лажок, тычок, шырыня швоў, чырвона—брунатны колер. У шчылінах паміж цаглінамі сядзяць сонныя павукі, а на гарышчах зьнерухомелі ў пыльным павуціньні сухія мёртвыя матылі — яны сталі ахвярамі, не пабачыўшы сьвятла.

— Ведаеш, — гаворыць Наталька, — я падманула.

— Што?

— Я нічога сёньня не зрабіла. Я не магла працаваць. У тым доме нехта страшна стагнаў. Стогне...

— Мабыць, няпраўда?!

Ідзем праз туман да пакінутага гаспадарамі дома. Нічога асаблівага — ні вокнаў, ні дзьвераў ужо няма. У высокім падмурку выбіты тры валуны.

— Там, — паказвае Наталька на чорны правал.

Ціха. Туман. Ніякіх гукаў, тым больш — стогнаў.

— Ты проста баішся пустых дамоў.

— Паслухай!

Я слухаю і нічога ня чую.

— Зараз залезу і пагляджу.

Нешта мяккае, вялікае кранае цёплым павуціннем мой твар. Гэта цемра. Яна жахлівая сама па сабе. З цемры даносіцца працяглы стогн. Страшна, дрогкі халадок бяжыць па сьпіне. Вочы адвыкаюць ад сьвятла, я бачу межы падвала — учарнелыя цагляныя сьцены. Бачу хворага голуба, які забіўся ў кут і нават не спрабуе ўцячы. Растрапанае пер’е, зацягнутыя плёнкай вочы — не дажыве да вечара.

— Няма тут нікога, — кажу я Натальцы і вылажу з сутарэньня.

— Што будзем рабіць?

— Палуднаваць.

Мы ідзем праз туман у “Пінгвін” на каву з малаком і коржыкамі.

Вы ведаеце, што такое ТЭАЛОГІЯ? Гэта навука, якая дапамагае пазнаць Бога.

Калі мне было 18 гадоў, я сябравала з вельмі разумнай дзяўчынай — Наталькай. Мы маглі гаварыць зь ёй пра ўсё на сьвеце: пра людзей і іх звычаі, пра жывёл і іх паводзіны, пра гісторыю і архітэктуру, пра любоў да бліжняга і каханьне... Цяпер мая сяброўка Наталька жыве ў невялікім нямецкім гарадку, вывучае тэалогію ва ўніверсітэце. Я часам уяўляю гэты гарадок, дзе не была ніколі, і назву якога ўвесь час забываю. Чыстыя брукаваныя вуліцы, ветлівыя студэнты і выкладчыкі, гарадская ратуша і пляц. На пляцы — галубы. Пасьля заняткаў Наталька корміць галубоў і думае пра Бога. У вучэньні яна знайшла свой супакой. Наталька не хоча вяртацца ў Менск. Яна хоча адчыніць ліцэй для бедных у Варшаве.

А я не магу знайсьці свайго супакою, не хачу з’язджаць. Не магу сказаць — чаго хачу. Вельмі часта бывае сумна, асабліва, калі туман.

1990 год

Магіла

Сяргей вёў запісы ў фіялетавым сшытку, але гэта не быў дзённік, хутчэй звароты да вышэйшае істоты, якая павінна назіраць за намі. “Няхай я буду вольным ад самалюбства, ад нячыстаты сэрца і думак на шляху да дасканаласці”, — было запісана на першай старонцы ў фіялетавым сшытку.

На цёмнай вуліцы Стэфан нечакана пачуў крокі і схаваўся за рог, прытуліўся спіною да цаглянай сцяны. Але яго ўсё роўна заўважылі “Прабачце, можа ў вас знойдзецца дзве капейкі?” — спытаў у Стэфана чалавек у чорным (ці цёмна—сінім?) плашчы — адзенне, трэба заўважыць, даволі дзіўнае для цёплай жнівеньскай ночы. Стэфан аддаў чатыры капейкі па адной і моўчкі павярнуўся тварам да сцяны. Праз хвіліну яму падалося, што чалавек усё яшчэ стаіць у яго за плячыма, азірнуўся — вуліца была пустая. Стэфан правёў рукою па шурпатай паверхні сцяны — пасыпаліся дробныя каменьчыкі.

Вокны кватэры, у якой Стэфан жыў разам з Сяргеем выходзілі на могілкі. Сяргею падабалася глядзець на магілы, яны яго супакойвалі. Стэфан сваім ключом адчыніў дзверы. Пастаяў на калідоры. “Ціха, — падумаў ён, — ціха, як... як у труне”. Цішыня ў кватэры, цішыня на вуліцы і на могілках, дзе белымі калёнамі выступалі з цемры бярозы, чарнелі мармуровыя пліты, соладка пахлі кветкі на магілах, дзе цяжка было разабрацца — што ўжо аджыло сваё, а што яшчэ жыве. Дзынкнула бітае шкло. Пабілі пустую пляшку? Ці гэта толькі падалося?

Стэфан разглядаў свой твар у круглым люстры, пра якое Сяргей казаў, што яно ўсё скажае. Што ў яго з вачыма? Адно — зусім нармальнае, блакітнае, другое — мутна—жоўтае, пачырванелае, як падбітае. Алергія?

Лямпа ў Сяргеевым пакоі свяцілася мяккім зеленкаватым святлом. Зялёнае святло таксама павінна супакойваць.

“Хай я буду лепшым, чым цяпер, больш шчырым з сабой і чулым на патрэбы іншых”, — пісаў Сяргей.

— Сяргей! — Стэфан адчыніў дзверы ў пакой.

— Што?! — Сяргей схаваў пад стол фіялетавы сшытак.

— Са мною нешта робіцца, глядзі — вока, якое страшнае стала.

— Такое, як табе трэба.

— Ды не гэтае, а другое.

— А я пра другое і кажу.

— Навошта мне такое? Ты здзекуешся!

— З табой інакш немагчыма. Ты ўлез у свой неўроз па самыя вушы, толькі ім і жывеш.

— Ты мог бы мне дапамагчы…

— Дапамагчы? Набяры верасу, запар сабе гарбаты. Можа дапаможа — супакоішся.

Стэфан марыў быць нябачным, каб яго зусім ніхто не бачыў, бо самі людзі ўжо даўно здаваліся яму ценямі, пазбаўленымі канкрэтнасці. Ён гадзінамі хадзіў па цёмных вуліцах, і калі на нейкі момант узнікала адчуванне спакою, то пасля нянавісць да самога сябе апаноўвала ім з новаю сілаю.

— Прабачце, вы не маглі б мне дапамагчы? — чалавек у плашчы спыніў Стэфана каля тэлефона—аўтамата.

— Дапамагчы? А што трэба зрабіць?

— Трэба затэлефанаваць. Я скажу нумар. Чалавек аддаў Стэфану грошы — чатыры капейкі па адной.

— Тэлефануйце — 54-31-32.

Стэфан паслухмяна набраў нумар. Доўгія гудкі.

— Паспрабуйце яшчэ.

Стэфан зноў, ужо па памяці набраў нумар. Да тэлефона ніхто не падыходзіў.

— Варта паспрабаваць яшчэ.

Фары машыны, якая з’явілася неяк раптоўна, асвяцілі ўсё навокал. Стэфан пачуў у сябе за плячыма кароткі — ці то смех, ці то стогн. Машына праехала, на вуліцы зрабілася яшчэ цямней. Стэфан павярнуўся, каб сказаць, што не збіраецца болей тэлефанаваць, але чалавек знік. Па вуліцы праехала яшчэ адна машына.

Стэфан не ведаў, што верас расце на пясчанай, неўрадлівай глебе, не ведаў, што яго не варта шукаць зранку на гарадскіх могілках, дзе ад магілы да магілы ў пошуках пустых пляшак блукае бабка з абшарпанай торбай, а з—за кустоў бэзу чуецца:

— Мікола! Мне з табой сумна…

— Ну, скаціна, ну скаціна…

— Мне сумна з табою…

— Скаціна!

“Класныя хлопцы, — падумаў Стэфан, — а хто скаціна?”. На магільных агароджах, а там, дзе іх не было — проста на крыжах былі прымацаваны таблічкі. Металёвыя таблічкі, чорныя, з надпісам, зробленым белаю фарбаю:

Спецкомбинат сообщает

Вам, что Ваша могила

подлежит переносу,
справки по телефону
54-31-32.

Стэфана проста паралізавала, ён перачытаў аб’яву некалькі разоў і заплюшчыў вочы, але цёмна не стала, адразу забегалі аранжовыя колы, замітусіліся зялёныя кропачкі, потым цемра загусцела і з гэтае цемры выляцеў павучок. Зялёны павучок з чырвоным вокам. Павучок падскокваў на сваіх шасці нагах, падміргваў, круціў вокам і не збіраўся знікаць. “Мікола! Мікола!” — рэзкі крык вывеў Стэфана са стану сузірання павучка. Ён расплюшчыў вочы. Усё паплыло, захісталася, магільныя агароджы і крыжы пачалі выгінацца. “Спецкамбінат ноччу зачынены, туды проста немагчыма датэлефанавацца”, –падумаў Стэфан і стаў прабірацца да цэнтральнай алеі. Вельмі хутка ён выбраўся на асфальт. Перад ім таропка ішоў, амаль што бег хлопец у блакітных джынсах і цёмна—брунатным швэдры.

— Мікола! — нечакана для сябе паклікаў Стэфан. Хлопец спыніўся.

— Хто скаціна? — спытаўся Стэфан.

— Скаціна! — адказаў Мікола.

“О Божая вечнасць! Прымі нас да ціхага спачынку свайго”, — пісаў Сяргей у фіялетавым сшытку.

1989 год

Замена фону

Дом фота

Вітрына з прыкладамі паслугаў Менкага дома фота мяне ўразіла і напалохала. Па сутнасці, прапануецца фальсіфікаваць сямейную гісторыю — спалучаць на здымках людзей, якія ніколі разам не фатаграфаваліся, альбо прыбіраць са здымкаў тых, хто па нейкіх прычынах няўгодны. Гэта мана сабе і людзям. А „замена фона" — яшчэ тая паслуга. Змрочны фон калідору у "хрушчоўцы", замяняецца на прыгожае зялёнае футбольнае поле. Я раней не ведала, што людзі такое робяць. Была перакананая, што толькі палітычную гісторыю фальсфікуюць. Так паступова знікалі паплечнікі Сталіна з фотаздымкаў — і зразумела, чаму знікалі. Яны знікалі не толькі з фотаздымкаў, але і з жыцця. Вось два фота — малады вайсковец і маладая дзяўчына. І вось — яны ўжо разам на адным фота? Навошта? Не сфатаграфаваліся разам? Значыць была на тое прычына. Альбо жанчына немаладая каля аблезлага плоту сфатаграфаваная — а ёй фон змянілі — жытнёвае поле. Навошта? Каб "красіва было"? Мая сяброўка рэжысёрка і грамадская актывістка Вольга Мікалайчык лічыць: — Чалавек прагне аднолькава — як самападману, так і не існуючай вакол яго гармоніі, альбо не заўважанай своечасова прыгажосці . Імітацыя, ілюзія сёння актуальныя, як ніколі: не важна рабіць у сваім жыцці нармальны фон — яго можна будзе памяняць на фота ў фоташопе ці ў фотаатэлье. Калі путана вешае на сцяну свой партрэт у касцюме Беласнежкі — яна не робіцца больш шчасьлівай. Можа ў гэтае фота паверацць ейныя чыстыя сумленныя нашчадкі — мы ж не ведаем. Мараль грамадства пакуль яшчэ патрабуе адрэтушаваных фотак на сцяне дома, сцяне фэйсбуку… Гэта, напэўна добра, што ёсць мяжа маралі ў соцыюме, але страшна, што яе часам няма ў самім чалавеку. А я так думаю — хочаш добры фон — дык зрабі яго ў сваім жыцці добрым.

Гімн СССР у аўтобусе "Вільня—Менск"

На мяжы ў салоне аўтобуса "Вільня—Менск" нечакана загучаў гімн Савецкага саюзу. Я нават стукнулася каленкай аб сядушку — у няўсвядомленым парыве ўстаць — так да ўзроўню рэфлексу навучылі нас уставаць пры гуках гімну. Гэтаму ўставанню пад гімн былі прысвечаныя цэлыя ўрокі спеваў — гімн і спявалі, і слухалі, і ўставалі пад яго. З гімну СССР пачынаўся дзень — а шостай ён гучаў па радыё

— спачатку гімн СССР, а пасля — гімн БССР. Пад гімн я ўставала і пачынала збірацца на ранішнюю трэніроўку — яйка на сняданак, гарбата — і наперад. Такая асацыяцыя — холодны цёмны ранак і гімн. У салоне аўтобуса “Вільня—Менск” гімн СССР гучаў з мабільнага кіроўцы — званок. Сам кіроўца ў гэты час адсутнічаў — адлучыўся ў краму безпадаткавага гандлю. Аўтобус стаяў на мяжы. Званок гучаў доўга. І да тэлефону стаў пабірацца чарнявы малады хлопец, які да гэтага гучна распавядаў пасажырам, што ён уцякач з Луганскай вобласці, атрымаў прытулак у Літве і мае ў Вільні бізнес, а яго сястра жыве вельмі добра у Менску. Гукі гімну абарваліся Уцякач ускінуў рукі і ў стылі КВНу і загаласіў: — Как хорошо, я думал, что заплачу. Пасля пачаліся размовы. Удзельнічалі чатыры чалавекі — жанчына з Менску, уцякачка з Усходняй Украіны, якая жыве ў Італіі, і такая самая — з Германіі. Яны жаліўся на „бесчалавечных еўрапейцаў” — на адну з іх нямецкі кіроўца сказаў “швайн”, за тое, што яна без дадатковай аплаты везла 4 чамаданы. Яны жахаліся ўцекачам з Сірыі і прадракалі “канец Еўропы”, клялі Гарбачова („сучка”) і Парашэнку. Жанчына з Менску казала пра тое, як добры было без нацыяналізму, як яна зайздросціла украінцам, бо ў іх памідоры растуць без цяпліц. Хлопец з Луганшчыны кляў віленскіх дзяўчат і крыўяляючыся чытаў беларускія назвы ўздоўж дарогі: — Манькаўшчына. Ха-ха-ха. Жанчына з Менску зрабіла яму заўвагу: — А если бы я приехала в Укрвну и смеялась над вашими назваииями? — А я бы смеялся вместе с вами.

Сны на праспекце Машэрава

У 1986-1987 годзе мы жылі ў інтэрнаце БДУ па праспекце Машэрава каля “Рамонку”. Пяціпавярховая жахлівая будыніна — адзіны дом, пра знос якога я не шкадую ані разу. У інтэрнаце жылі студэнты філфаку і юрфаку (сярод іх было вельмі шмат воінаў—афганцаў). Атмасфера ў інтэрнаце была нездаровая — ва ўсіх сэнсах. А па—за межамі інтэрнату віравала насычанае культурніцкае жыццё. У той час я далучылася да беларускага руху і спрабавала пісаць апавяданні, якія не хапала мне смеласц зачытаць ні на адным з літаб’яднанняў — ні на фармальных, ні на нефамальных. Кожны дзень тады, у часы перабудовы, быў цікавы і прыносіў, але ў 18 гадоў я была не гатовая занатоўваць рэчаіснасць. І запісвала свае сны. Як цяпер разумею і ў снах адбівалася рэчаіснасць. Вось фрагмент сноў тых часоў: “Душа, загартаваная ў пакутах, вырвалася на волю і памкнула на бойку з Цмокам. Цмок сядзеў у логвішчы, падціскаў свае

курыныя кіпці і выпускаў з носа дым. Душа спачатку спынілася на зялёнай траве каля ручая, дзе на дрэве вісеў меч. Душа ўзняла меч і знерухомела над празрыстай, хуткаплыннай вадой, углядалася ў яе пакуль з дрэва не зваліўся вялізны апельсін. Зваліўся і паплыў. А душа ўсё ўглядалася ў ваду — чакала, каб яшчэ што ўпала ці наадварот вынырнула. Не дачакаўшыся, уздыхнула цяжка і паляцела да жытла Цмока. Шлях да яго выпалены, заліты атрутнымі цмокавымі кроплямі — не прайсці, толькі даляцець можна. У цмока камфортнае жытло: зверху горны валун, пад ім пячора. Дзверы жалезныя, і ўсё ў самой пячоры металёвае. Глыбока ў сутарэннях цмок хаваў скарбы авіякатастроф, якія сам і арганізоўваў. І яшчэ захоўваецца там каністра з ВЕРАЙ У АГУЛЬНУЮ СПРАВУ ў выглядзе вадкасці. Душа выпакутавала права на адкрытую сутычку з Цмокам. Цмок адчуў, што ў паветры лунае штосьці нязведанае, ён рушыў наперад. Тут меланхалічная душа апынулася над цмокам і ўжо занесла меч, але сыходзячая ад яе хваля расчаравання ўзняла цмока ў паветра, патрымала некалькі імгненняў і адпусціла, кінула на зямлю. Ён спрабаваў устаць, яшчэ шкрабаў пясок кіпцямі, пускаў дым, але хутка зразумеў, што ўжо не прыйдзецца таптаць яму курынымі лапамі траву і арганізоўваць авіякатастрофы. І тады запытаўся цмок у самотнай душы: “Хто ты? Якога роду? Бо трэба мне ведаць праз каго скончылася жыццё маё ?” А душа адказвала: “Невядома мне імя маё, роду не маю я і нічога не чула пра продкаў сваіх”. Тады Цмок сказаў так: “Навошта хлусіш мне, ужо канаю я. Кожны мае імя і род. Адкуль ты? Бязважкая душа апусцілася на траву: “Я памяці не маю…” І апошні раз сказаў Цмок: “Я ведаю, што толькі моцны дух мог перамагчы мяне. Дзіўна, што гэта ты, які жыве без памяці, але відаць слаўны род маеш, бо я канаю…” У бязмежным нябесным prасторы праплыла хмара, скончылася цмокава жыццё. Душа блукала ў падземных схованках, скарбы авіякатастроф яе не цікавілі, яна шукала тую самую каністру. Знайшла, выцягнула на свет і паляцела. Душа ляцела, вярталася, было шэсць гадзін раніцы, па радыё зайгралі гімн СССР”.

Сацыяльны сертыфікат і Пекла

Ты ездзіш сама на машыне? — пытаюся ў сяброўкі. — І не збіраюся. Навошта мне, я роварніца і цягнікоўка. — Ёсць жа людзі… а то цяпер, як не на машыне, — то не чалавек — Ай, навошта ў гэта гуляць. Гэта такі сацыяльны сэртыфікат. калі за трыццаць — хата, дача і машына. За 40 —кіроўная пасада. у 50 — пышны юбілей з

морам кветак і шырокія сувязі. 60-70 — вялікая пенсія. 80 — вялікі помнік на Маскоўскіх могілках. — Можна скараціць і зрабіць помнік у 50, ці ў 30 — яшчэ лепей, не трэба імкнуцца нават да кватэры — дамавіна А яна мне: — Я так і думала, што дамавіна будзе маім першым уласным жытлом). Сацыяльныя ролі і сацыяльныя маскі. За празмернай весялосцю і жартаўлівасцю хаваецца ўнутраная істэрыка. За стрыманасцю — шалёнасць. Часцей за ўсё скончаюць жыццё самагубствам людзі знешне паспяховыя і забяспечаныя, пакідаючы пасля свайго сыходу толькі пытанні: чаму і як такое магло здарыцца? Сыходзячы, сваё ўнутранае пекла яны забіраюць з сабой. Яшчэ адна мая сяброўка тлумачыць самазабойствы паспяховых людзей так: “Нейкія моцныя пакуты адчувае чалавек такі — і прыемныя моманты для яго не маюць ні сэнса, ні ўражаньняў — яны не памятаюць прыемных момантаў, як навароджаныя — чыстыя ў сваёй смяротнай шызе. Суіцыд для іх і быў тым самым прыемным момантам жыцця, як катарсіс альбо аргазм, напэўна”. Што адбылося на самай справе — ніхто і ніколі не зразумее. І тлумчэнне пра выпрацаваны рэсурс здаецца самым прымальным.

Тапачкі для афіцэра

“З расейскага боку на Данбасе ваююць пераважна рэканструктары”, — кажа украінскі калега. Гэта тыя самыя людзі, якія ў дарослым узросце кампенсавалі сваю экзістэнцыйную пустэчу гульнямі ў вайну з пераапрананнем ды праглядамі ваенных кінадрам. Гульня ў вайну выйшла з—пад кантролю — пераўтварылася ў вайну сапраўдную — такія парадоксы свядомасці ды рэальнасці. Травень 2015 года... чарговы патрыятычна—шавіністычны аўтапрабег у Воршы — ад помніка „Кацюшы” даносіцца па Дняпры палымяная прамова: „Наше Союзное государство от Бреста до Владивостока. И никикие НАТО нам не страшны”. Бу-бу-бу-бу „Луганская Народная Республика” і музыка “Там за туманамі”. Псеўдарэканструкацыя... Па тэлевізары транслюецца чарговая расейская ваенная драма — салдаты бягуць у атаку з крыкамі “Мачыце немцаў!” (гэта ж слова якое падабралі рэжысёр са сцэнарыстам). І зноў: паказваюць па тэлевізары ваенную драму “Застава Жыліна” — пра савецкую мяжу напярэдадні нападу Германіі на СССР. Час, калі адбываецца дзеянне — травень 1941 году. Месца дзеяння — памежная зона пад Берасцем. Бачым: на рэчцы чырвонаармейцаў спакушаюць мясцовыя дзяўчаты, якія гавораць па—расейску чамусьці з яўным балтыйскім акцэнтам, а ідэйныя чырвонаармейцы называюць іх “дуры польскія”. Пра

Беларусь — ані слова. Беларускага акцэнту таксама няма. У фільме ёсць Расея (нават не СССР і „былая Польшча). І тое, што гэта „былая Польшча” падкэсліваецца паказам мясцовых палякаў з дзіўным акцэнтам і пабытовымі звычкамі. Сям’ю савецкага афіцэра засяляюць да адной такой пані. Яе разам з сынам—падлеткам кватаранты пасля заб’юць, але пакуль яна гэтага не ведае і ставіць ўмову — нікога не прыводзіць у госці і здымаць абутак пры ўваходзе. Вядома, у госці прыходзіць савецкі афіцэр, абутак не здымае, гаспадыня галосіць: “Як можна было не зняць абутак?”Савецкія афіцэры пагражаюць пісталетам. Сцэнарыст фільма яўна гадаваўся ў маскоўскай кватэры з абавязковымі тапачкамі ля ўваходу — як праявы найвышэйшай культуры. Цяжка выйсці за межы сучаснай маскоўскай рэальнасці і падумаць пра тое, што ў 1941 годзе ўсё было не так, і афіцэры (у форме!!!) не сцягвалі боты, заходзячы ў памяшканне і не абувалі тапкаў. І ўвогуле — здымаць абутак — усходняя традыцыя.

Зло, якое прыкідваецца дабром

Ёсць такое зло, якое прыкідваецца дабром, на яго тле, зло, якое нічым не прыкідваецца выглядае зусім бякрыўдным — бачыш, што зло — абыйдзі. Іншая справа зло, якое прыкідваецца дабром. Я называю гэта Тры Х — хітрасць, хцівасць, хіжасць. Адэпты такога зла наскрозь прытарныя і фальшывыя. А яшчэ вельмі часта практыкуюць модную цяпер аптымістычную псіхалогію і радасна супрацоўнічаюць з уладай. І “сонечна” (а як для чалавека, які разумее, — нацягнута) ўсміхаюцца. Гэта не ўсмешка— грымаса. Ёсць знакаміты фільм „Залатая ліхаманка” з Чарлі Чаплінам, дзе галодны барадаты злыдзень глядзіць на Чапліна, які ператвараецца для яго ў велізарную курыцу. Гэта значыць, Чапліна як чалавека есці нельга, але ў барадатага ўзнікае замена рэальнай рэчаіснасці ідэалагічнай мадэллю — гэта не чалавек, гэта курыца, якую можна з’есці. Раз гэта курыца, значыць з’есці яе гэта нармальна— бо я ж есці жадаю, я паміраю з голаду. Для гэтага і існуе прапаганда, яна падмяняе рэальнасць, вобразам, патрэбным улады. Існуюць розныя варыянты… Можна спаслацца на той жа фільм, калі Чарлі Чаплін есць чаравік і ўяўляе, што шнуркі гэта спагецці, а цвічкі — костачкі. Ён паводзіць сябе не як людажэр. У яго іншая ідэалогія. Але любая ідэалогія замяняе сабой рэальную рэчаіснасць, каб апраўдаць паводзіны чалавека, паводзіны ўлады, паводзіны партыі, паводзіны лідара. А ў Беларусі прапагандысты падмяняюць рэальнасць вобразамі па прынцыпе — „Беларусь сёння. Правільны выбар” („мы самыя лепшыя, усе нам зайздросцяць і так

трымаць”). Усё гэта цяжкімі штампамі ўпрэсоўваецца ў свядомасць праз дзяржаўнае радыё, тэлебачанне, газеты. І яшчэ праз людзей, якія з аптымізмам пераконваюць блізкіх, што зло ёсць дабро.

“Пінгвін” і Верхні горад

Снежань 1987 году. На вуліцы Леніна ў Менску — кавярня “Пінгвін”, і ніхто нават не думае, што некалі яе не будзе. І яшчэ 4 гады да развалу СССР. У 1987 развал СССР уяўляецца слаба, як і знікненне кавярні “Пінгвін”. Зрэшты, яшчэ ёсць час, ні пра тое, ні пра другое асабліва ніхто не задумаецца.

Верхні горад рыхтаваўся да адсялення і рэстаўрацыі. Будынкі пакрыліся чырвона—брунатнымі плямамі архітэктурных зондаў.

Зонды выкрывалі змены, якія перажывалі будынкі, пераробкі і пераўтварэнні, схаваныя пад тынкоўкай. Зменаў хапала: на месцы дзвярэй узнікалі вокны, на месцы вокнаў — дзверы, замест брамы паўставала глухая сценка.

У той час я сябравала з вельмі разумнай дзяўчынай — Натальkай. Мы працавалі ад Акадэміі навук у архітэктурна—археалагічным атрадзе “Верхні горад”: замалёўвалі фасады дамоў — вулічны і дваравы. На намаляваных фасадах дамоў адзначалі архітэктурныя зонды — месцы, дзе адмыслова знята тынкоўка, каб можна было бачыць цэглу. У зондах замяралі цэглу: лажок, тычок, шырыня швоў, колер чырвона-брунатны. Старая цэгла распавядала гісторыю будынку і яго перабудоваў, што павінна было спрыяць якаснай рэстаўрацыі.

А каву хадзілі піць у “Пінгвін”. Цяпер пра гэтыя халодныя дні засталіся толькі ўспаміны.

Вуліцы: Інтэрнацыянальная, Музычны завулак, вуліца Герцэна, вуліца Бакуніна.— усе яны скіраваныя да ратушнага пляцу. Ратушы на той час няма, але ёсць спадзяванне, што яе адновяць.

Музычны завулак, дом наступны за Домам масонаў.

Малюю абрысы фасаду на вузкай вуліцы, якая калі—небудзь прывядзе да ратушы.

Мераю цэглу, а калі робіцца зусім сумна, пішу на сценах алоўкам вершы маладых беларускіх паэтаў, якія мне падабаюцца. Спадзяюся — нехта прачытае.

Рукі мерзнуць — ад цэглы. Туман густы, у некалькіх кроках улева і ўправа — нічога не разгледзець. У доме на першым паверсе гарыць святло. Праз запацелае шкло бачу стол са сняданкам, венскае крэсла — на ім — паласаты кот.

Хутка, зусім хутка жыццю ў Верхнім горадзе прыйдзе канец, і нічога не будзе. З'едуць гаспадары, І хто ведае — ці забяруць венскае крэсла і коціка ў новае жыццё. Адбудзецца рэстаўрацыя. І ўсё навокал зменіцца.

У снежні 1987 года за вокнаммі "Пінгівіна" у менскім тумане праплывалі цені мінакоў... Здаецца і цяпер я калі—некалі бачу тыя цені.

Брылі

Ехалі на поле Аршанскай бітвы (Крапівеньскае поле) на аўтобусе "Ворша—Дуброўна". Каб трапіць на поле трэба выйсці на прыпынку — паварот на Гацькаўшчына, а перад гэтым прыпынкі — Брылі і Крапіўна.

У аўтобусе "Ворша—Дуброўна" перад намі сядзелі — жанчына гадоў 60 і хлопчык з яркім школьным ранцам. Хлопчык уголас чытаў назвы ўсіх прыпынкаў.

— "Брылі"... Бабушка, а что такое "Брылі»?

— Брылі?... Брыль — это старинное слово, твой прадедушка носил брыль.

Цікавы адказ. Слова старое. А што такое "брыль", як і дзе яго насіў прадзед хлопчыка — не патлумачыла. Быццам бы і так зразумела, што — брыль — гэта брыль. Старажытная назва, якая называе прадмет, якога ўжо няма. І насіў яго чалавек, якога ўжо няма.

Хлопчык працягваў чытаць назвы прыпынкаў:

— Кра-піЎ-на, — амаль выкрыкваў ён назву наступнага прыпынку, вылучаючы "Ў", — Крапіўна — это по—беларуски?

Бабуля не адказвала, глядзела у вакно з тварам каменным, напружана-задуменным. Такі выраз твару бывае на прыёме ў псіхатэрапеўта, калі доктар нарэшце задае пытанне, якое закранае балючы момант з мінулага, які не хочацца чапаць. Траўматычны момант.

Старыя словы. Словы з мінулага. Недзе там, у мінулым — засталося жыццё, дзе мужчыны хадзілі ў брылях. Там быў свой побыт і прадметы побыту, адзенне — і усё гэта мела свае назвы — не расейскія. Іншы свет, іншы погляд на свет. Іншыя рэчы, іншыя словы.

Напрыклад, брылі ці Брылі — з вялікай літары –назва вёскі.

Аўтобус ехаў уздоўж поля Аршанскай бітвы. Сёлета — 500 год Аршанскай бітвы, — да наступнага юбілею — ніхто з нас не дажыве — факт. Як адсвяткавалі юбілей? Як здолелі адсвяткаваць, так і адсвяткавалі.

І вось вёска Брылі. Мала хто ведае, але 6—га верасні 2014 года ў Брылях адбыўся невялікі Фэст бардаўскай песні, прысвечаны Аршанскай бітве. Фэст зусім невялікі — удзельнікаў разам са слухачамі было 16 чалавек. Кажуць, што ў свой час бардаўская песня дапамагла разваліць СССР, але час той мінуў…

— Кра-піЎ-на! Па-беларуску? Па-беларуску? — звініць пытанне ва ўсім аўтобусе. І цішыня ў адказ. Маўчала бабуля. Маўчалі і астатнія пасажыры… Хто яго ведае, што ў нас па—беларуску, а што — не?

У красавіку гэтага году ў Вільні мне давялося пагаварыць з Хуанам — псіхатэрапеўтам з Парыжу. Хуан працуе з людзьмі — ахвярамі катаванняў, ўзброеных канфіктаў і войнаў. Хуан казаў пра тое, што траўма разрывае не толькі жыццё чалавека, але і яго асобу на дзве паловы — на тое, што было да траўмы і тое, што атрымался пасля. І для таго, каб вярнуць чалавека да жыцця і да самога сябе — трэба аб’яднаць гэтыя дзве часткі асобы. Спачатку пракласці паміж імі сляды, а пасля — уз’яднаць часткі разарванага. А пасля можна атрымаць супакой, упэўненасць, раўнавагу ды здольнасць самому выбіраць дарогі, па якіх рухацца.

Верасень 2014 — вераень 2015

Змест: